ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 37-ы
№ 60 (2226)
30 ліпеня 1968 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

50 год БССР — НАСУСТРАЧ САЛУТНАМУ ЮБІЛЕЮ

ЗДАБЫТКАМ РАСЦІ, ПАМНАЖАЦЦА

Э. ГЛАДКОВІЧ,
начальнік Гомельскага абласнога ўпраўлення культуры

Зупўненасцю можна сказаць, што няма цяпер такога кутка на Гомельшчыне, дзе б не рыхтаваліся да 50-й гадавіны з дня ўтварэння нашай рэспублікі. Рыхтуюцца да гэтага слаўнага юбілею і культасветустановы нашай вобласці. Каб даць хоць агульнае ўяўленне аб размаху гэтай работы, я назаву некалькі лічбаў.

Сёлета калектывы мастацкай самадзейнасці за паўгода далі звыш шасці тысяч канцэртаў і спектакляў, 1500 разоў выступілі агітбрыгады. Гэтыя выступленні глядзела каля паўтара мільёна чалавек. У кожнай вёсцы вобласці такія выступленні адбыліся па два-тры разы, а да канца года іх колькасць павялічыцца да шасці разоў. Не пакінулі мы па-за ўвагай і жыхароў невялікіх паселішчаў, дзе няма клубаў і чырвоных куткоў. Для абслугоўвання іх створаны спецыяльныя перасоўныя аўтаклубы «Салют Кастрычніку». Іх дзейнасць знаходзіць шырокае адабрэнне ў працаўнікоў сяла.

Нашы культармейцы стараюцца працаваць творча. Кожная ўстанова культуры імкнецца прыдумаць нешта сваё, адметнае, не такое, як у суседзяў, каб усе намечаныя мерапрыемствы правесці як найлепш, каб яшчэ больш узрасло іх эмацыянальнае ўздзеянне. Працягваецца спаборніцтва за ўзорнае культурнае абслугоўванне працоўных горада і вёскі. Ідуць конкурсы-агляды на лепшую клубную ўстанову, лепшы юбілейны канцэрт, праводзяцца этапы культуры.

У нашай вобласці працуе амаль чатыры тысячы гурткоў мастацкай самадзейнасці. У сувязі з пераходам на пяцідзённы рабочы тыдзень колькасць удзельнікаў мастацкай самадзейнасці намнога ўзрасла.

Характэрна і тое, што і ўзровень выканаўчага майстэрства стаў не той, які быў, скажам, гады два-тры назад. Агляд індывідуальных выканаўцаў па ўсіх жанрах, які нядаўна правяло ўпраўленне культуры ў гонар юбілею рэспублікі, выявіў многа раней малавядомых таленавітых удзельнікаў самадзейнасці. Такія ж вынікі паказаў і агляд агітацыйна-мастацкіх агітбрыгад, у якім прыняло ўдзел больш двухсот калектываў. Многія з іх выступілі з зусім новымі змястоўнымі і вострымі праграмамі, пабудаванымі на мясцовым матэрыяле.

Росту выканаўчага майстэрства ўдзельнікаў самадзейнасці садзейнічаў і садзейнічае спецыяльны агляд-конкурс музычных школ вобласці па аказанні шэфскай дапамогі сельскай самадзейнасці. Да кіраўніцтва гурткамі ў сельскіх і калгасных клубах прыйшлі дзесяткі таленавітых спецыялістаў, выкладчыкаў гэтых навучальных устаноў.

Свой уплыў, безумоўна, аказала і тое, што мы пастаянна павышаем дзелавыя якасці ў тых кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці, якія працуюць не першы год. У кожным раёне зараз дзейнічаюць пастаянныя семінары, арганізаваны пункты кваліфікаванай дапамогі пры раённых і гарадскіх дамах культуры. Пашырылі мы і такую практыку — праводзіць творчыя канферэнцыі кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці на базе вядучых калектываў вобласці.

Акрамя таго ў нас працуюць 10-месячныя пастаянна дзеючыя калгасна-саўгасныя курсы па падрыхтоўцы кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці. За дзевяць гадоў яны выпусцілі ўжо больш чатырохсот кіраўнікоў танцавальных і драматычных калектываў, духавых аркестраў. Сёлета на работу курсаў звяртаецца асаблівая ўвага. Адкрыта спецыяльнае аддзяленне мастакоў-афарміцеляў.

Каб папоўніць рэпертуар харавых калектываў і індывідуальных выканаўцаў высокаідэйнымі і высокамастацкімі творамі, секцыя самадзейных кампазітараў пры абласным Доме народнай творчасці адкрыла на старонках «Гомельскай праўды» спецыяльную рубрыку — «Самадзейныя кампазітары Гомельшчыны — 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі». Ужо змешчаны ў газеце і трывала ўвайшлі ў рэпертуар самадзейнасці лепшыя творы кампазітараў Гомельшчыны.

У гэтыя дні ў вобласці праходзяць адборачныя канцэрты-справаздачы гарадскіх і сельскіх калектываў. Пераможцы гэтага папярэдняга агляду выступяць на сцэне парку культуры і адпачынку імя А. В. Луначарскага.

Сталі традыцыйнымі святы песні. Сёлета яны прайшлі ва ўсіх раёнах, але асабліва цікава — на Рагачоўшчыне і Брагіншчыне. Шасцісотгалосы аб'яднаны хор славіў у песнях радасць мірнай стваральнай працы, спяваў аб шчаслівым жыцці хлебаробаў. Яшчэ раней паўсюдна прайшло свята «Юбілейная вясна». У ім прынялі ўдзел дзевяцьсот хораў, сотні танцавальных калектываў, тысячы індывідуальных выканаўцаў.

Цікавую харэаграфічную кампазіцыю «На безымянная вышыні» рыхтуе ансамбль песні і танца «Дняпро». Парадуе таленавітыя калектыў гледача і яшчэ адной навінкай — танцам «Прыдняпроўскія бандары». Абнаўляюць свае праграмы Петрыкаўскі народны хор, ансамбль песні і танца Рэчыцкага фанера-мэблевага камбіната і іншыя калектывы. Рыхтуюць юбілейныя спектаклі і народныя тэатры: Мазырскі — «Партызаны» К. Крапівы, Рэчыцкі — «Брэсцкая крэпасць» К. Губарэвіча, Жлобінскі — «Выбух» М. Гарулёва і М. Алтухова і г. д. Хутка яны вынясуць новыя работы на суд гледача.

Мастацкае абслугоўванне працаўнікоў горада і сяла ў юбілейным годзе палепшылася і таму, што пачала дзейнічаць абласная філармонія. Толькі за першы квартал г. г. брыгады філармоніі абслужылі каля дзвюхсот тысяч гледачоў, далі 770 канцэртаў. Большая частка гэтых канцэртаў адбылася на сяле. Разгарнула філармонія і прапаганду музычных ведаў. Толькі ў першым квартале праведзена звыш дзвюхсот спецыяльных лекцый-канцэртаў.

Калі зайшла ўжо гаворка пра прафесіянальныя калектывы, то адзначу, што некалькі палепшыў работу і абласны драматычны тэатр. За апошні час ажыццёўлены такія цікавыя, на маю думку, пастаноўкі, як «Мяшчане» М. Горкага і «Пасля пакарання прашу» Э. Долгага. Зараз галоўны рэжысёр тэатра І. Папоў рыхтуе інсцэніроўку аповесці С. Грахоўскага «Рудабельская рэспубліка». Спектакль па ёй будзе прысвечаны юбілею рэспублікі.

За першае паўгоддзе ва ўстановах культуры прачытана звыш пятнаццаці тысяч лекцый і дакладаў, праведзены тысячы іншых масавых мерапрыемстваў — вечароў баявой і рэвалюцыйнай славы, сустрэч з ветэранамі рэвалюцыі і войнаў. Па прыкладу ўстаноў культуры Калінкавіцкага раёна ўсе клубы і бібліятэкі вобласці ўключыліся ў паход-эстафету «Ад помніка да помніка». Работнікі культуры Брагінскага і Хойніцкага раёнаў выступілі з яшчэ адным каштоўным пачынам — ствараць клубы баявой і рэвалюцыйнай славы.

Лекцыі і даклады, якія прысвячаюцца дзейнасці заснавальнікаў марксізма-ленінізма, слаўнаму шляху нашай рэспублікі, заўсёды збіраюць вялікую аўдыторыю. Тысячы слухачоў наведвалі нашы універсітэты культуры. А ў нас іх каля трыццаці, і амаль усе паспяхова закончылі навучальны год.

Вечары рэвалюцыйнай і баявой славы, сустрэчы з ветэранамі рэвалюцыі і войнаў, перадавікамі і ветэранамі працы праходзяць цікава і разнастайна. Гэта і шчырая сардэчная размова старэйшых з моладдзю, і вусныя часопісы і альманахі, і тэатралізаваныя прадстаўленні і сумесныя паходы па месцах баёў і дыслакацый партызанскіх брыгад, аднаўленне партызанскіх зямлянак, і мнагалюдныя нядзельнікі па закладцы мемарыяльных садоў, паркаў і сквераў, Курганоў вечнай славы, помнікаў і Сцен Бяссмерця. Летась, напрыклад, было закладзена на тэрыторыі вобласці звыш чатырохсот паркаў і сквераў, узведзена 12 Курганоў вечнай славы, устаноўлены сотні помнікаў героям Айчыннай вайны. Шырока праводзіцца гэтая работа і сёлета. На закладку і адкрыццё помнікаў, як правіла, запрашаюцца блізкія і сваякі загінуўшых воінаў і партызан. Тут жа праводзяцца ўрачыстыя прыёмы школьнікаў у піянеры, уручэнне камсамольскіх білетаў.

Важнае месца ў рабоце клубаў і бібліятэк у гэтыя дні займае прапаганда твораў У. І. Леніна, літаратуры і твораў мастацтва пра вялікага правадыра. Працуючы пад дэвізам «Кнігу Леніна — у кожную сям'ю, кожнаму маладому рабочаму і калгасніку», культасветработнікі імкнуцца прыцягнуць да чытання ленінскіх прац як мага большую колькасць чытачоў. Такая ж вялікая работа вядзецца і з літаратурай, прысвечанай юбілею.

Нядаўна ў Светлагорскім Доме культуры энергетыкаў урачыста адкрыўся музей баявой і працоўнай славы. У той жа дзень змаглі прагледзець шматлікія экспанаты, дакументы, рукапісы сотні жыхароў горада. Падоўгу стаялі яны ля экспазіцыі, якая расказвала пра гісторыю Светлагоршчыны за 50 гадоў.

Новыя экспазіцыі, прысвечаныя юбілею Савецкай Беларусі, адкрываюцца ў Рагачоўскім і Кастрычніцкім музеях.

Цяпер на Гомельшчыне працуе каля ста грамадскіх музеяў. Дзесяці з іх прысвоена назва «народны». Леташні абласны грамадскі агляд работы музеяў, ленінскіх пакояў, куткоў баявой і працоўнай славы значна садзейнічаў паляпшэнню іх работы.

Па пачыну Рудакоўскага сельскага клуба Хойніцкага раёна і Навасёлкаўскай бібліятэкі Петрыкаўскага раёна ў нас шырока разгарнуўся рух «За высокую культуру сяла». Абласны выканаўчы камітэт і аблсаўпроф аб'явілі з гэтай нагоды спецыяльны агляд-конкурс. Штомесяц клубы і бібліятэкі рапартуюць аб стварэнні зялёных зон адпачынку, танцавальных, спартыўных і дзіцячых пляцовак ад добраўпарадкаванні тэрыторыі каля клубаў.

Асобна хочацца спыніцца на будаўніцтве клубных устаноў. У гэтай справе намеціўся поўны пералом. Калі ў мінулыя гады ў сярэднім уступала ў строй па трыццаць-сорак сельскіх клубаў то летась у калгасах пабудавалі ўжо 81 клуб — на трынаццаць тысяч месц. Характэрна, што амаль усе яны ўзведзены па тыпавых праектах. Да юбілею рэспублікі будуць уведзены ў строй яшчэ больш васьмідзесяці клубаў на семнаццаць тысяч месц. Асабліва вялікую ўвагу звяртаюць на будаўніцтва і добраўпарадкаванне ўстаноў культуры ў Калінкавіцкім, Гомельскім, Жлобінскім і Добрушскім раёнах. Іх вопыт вывучаецца і пераймаецца.

Расказанае вышэй, зразумела, не ахоплівае ўсяе работы ўстаноў культуры нашай вобласці, накіраванай на дастойную сустрэчу 50-гадовага юбілею Савецкай Беларусі. Аб гэтым можна было б расказваць больш і лепш. Мы стараемся, каб тыя недахопы, якія яшчэ ёсць у гэтай справе, ліквідаваліся як найхутчэй, каб кожны дзень быў плённы, каб здабыткі ў павышэнні культуры насельніцтва раслі і памнажаліся.

МАЛАДОСЦЬ САБРАЛАСЯ Ў САФІІ

28 ЛІПЕНЯ Ў САФІІ ПАЧАЎСЯ IX СУСВЕТНЫ ФЕСТЫВАЛЬ МОЛАДЗІ І СТУДЭНТАЎ, ЯКІ АДБЫВАЕЦЦА ПАД ДЭВІЗАМ «ЗА САЛІДАРНАСЦЬ, МІР І ДРУЖБУ». ЮНАКІ І ДЗЯЎЧАТЫ СА 142 КРАІН СВЕТУ САБРАЛІСЯ Ў СТАЛІЦЫ БАЛГАРЫІ, КАБ СКАЗАЦЬ СВАЕ РАШУЧАЕ «НЕ» СІЛАМ ВАЙНЫ І ЦЕМРАШАЛЬСТВА, КАБ ПРАДЭМАНСТРАВАЦЬ СВАЕ АДЗІНСТВА Ў БАРАЦЬБЕ ЗА МІР, ЗА ШЧАСЦЕ, ЗА СВЕТЛУЮ БУДУЧЫНЮ ЧАЛАВЕЦТВА.

БЕЛТА.

УДЗЕЛЬНІКАМ IX СУСВЕТНАГА ФЕСТЫВАЛЮ МОЛАДЗІ І СТУДЭНТАЎ «ЗА САЛІДАРНАСЦЬ, МІР І ДРУЖБУ»

САФІЯ

Дарагія сябры!

Сардэчна вітаем вас, пасланцоў дэмакратычнай моладзі і студэнцтва ўсіх кантынентаў, што сабраліся ў сталіцы сацыялістычнай Балгарыі пад сцягамі салідарнасці, міру і дружбы.

Камуністычная партыя Савецкага Саюза, Савецкі ўрад, увесь савецкі народ разглядаюць IX Сусветны фестываль як вялікую падзею ў жыцці моладзі ўсіх краін. Яго мэты адпавядаюць карэнным інтарэсам маладога пакалення, задачам далейшай кансалідацыі ўсіх яго сіл у барацьбе супраць імперыялізму і вайны, за свабоду, сацыяльны прагрэс і нацыянальнае вызваленне, супраць каланіялізму і неакаланіялізму, за дэмакратыю і правы моладзі.

Радасна бачыць, што ў радах актыўных барацьбітоў з сіламі рэакцыі і вайны ўслед за сваімі бацькамі і старэйшымі братамі ідзе маладое пакаленне. Мы верым у моладзь, у яе рэвалюцыйныя, стваральныя сілы, у яе невычарпальную энергію і цягу да ўсяго новага, перадавога. Мы лічым нашу савецкую моладзь дастойнай зменай старэйшых пакаленняў у барацьбе за светлую будучыню. Савецкія юнакі і дзяўчаты — актыўныя будаўнікі камуністычнага грамадства і перакананыя інтэрнацыяналісты, яны выхаваны нашай партыяй і народам у духу брацкай дружбы з народамі іншых краін і баявой салідарнасці з усімі рэвалюцыйнымі, вызваленчымі і міралюбівымі сіламі.

Савецкі Саюз, верны прынцыпам ленінскай знешняй палітыкі, цвёрда і паслядоўна змагаецца супраць падкопаў агрэсіўных сіл імперыялізму, яго замахаў на свабоду і незалежнасць народаў, за ліквідацыю рэшткаў каланіялізму, за ўмацаванне мірных адносін паміж краінамі. Гэта палітыка адпавядае інтарэсам усіх працоўных народаў і моладзі.

Час, у які праходзіць ваш фестываль, патрабуе ад усіх сумленных людзей асаблівай пільнасці, усведамлення непасрэднай адказнасці кожнага за лёс міру і прагрэсу, сумесных энергічных дзеянняў супраць небяспечнага авантурыстычнага курсу ваяўнічых імперыялістычных колаў.

Дзевяты Сусветны фестываль заклікан стаць магутнай акцыяй моладзі ў падтрымку в'етнамскіх патрыётаў, якія мужна змагаюцца супраць амерыканскіх агрэсараў. Няхай фестывальны рух увальецца ў шырокае рэчышча салідарнасці з барацьбой гераічнага народа Вьетнама і іншых народаў, якія адстойваюць свае свяшчэнныя правы на свабоду і незалежнасць.

Мы ўпэўнены, што ў гарачых дыскусіях і задушэўных гутарках фестывалю, у ходзе творчых конкурсаў і спартыўных спаборніцтваў, у атмасферы энтузіязму яшчэ больш умацуецца ваша баявая дружба і згуртаванасць.

Жадаем вам, дарагія юныя сябры, поўнага поспеху ў гэтай новай яскравай дэманстрацыі адзінства і салідарнасці дэмакратычнай моладзі і студэнтаў свету.

Л. БРЭЖНЕЎ,
Генеральны сакратар ЦК Камуністычнай партыі Савецкага Саюза

А. КАСЫГІН,
Старшыня Савета Міністраў Саюза ССР.

ЯК БРАТЫ З БРАТАМІ

ДНІ В'ЕТНАМА Ў БЕЛАРУСІ

В'етнамскія госці ў піянерскім лагеры «Лясная казка».

В'етнамскія госці знаёмяцца з экспазіцыяй новага абласнога музея камсамольскай славы ў Скідэлі.

Фота П. НАВАТАРАВА і А. ПЕРАХОДА.

Дні В'етнама крочаць па Беларусі. На шматлікіх мітынгах, сходах і вечарах савецкія людзі выказваюць пачуцці дружбы і салідарнасці з гераічным в'етнамскім народам.

Раніцай 25 ліпеня надзвычайны і паўнамоцны пасол ДРВ у СССР Нгуен Тхо Цян, кіраўнік пастаяннага прадстаўніцтва НФВПВ у СССР Данг Куанг Мінь, дэлегацыя Таварыства в'етнама-савецкай дружбы на чале з намеснікам міністра цяжкай прамысловасці ДРВ Ву Анем, дэлегацыя Народных узброеных сіл Вызвалення Паўднёвага В'етнама на чале з героем АВПВ Чан Ван Дзінем наведалі Мінскі аўтамабільны завод. Тысячы аўтазаводцаў сабраліся ў абедзенны перапынак на мітынг савецка-в'етнамскай дружбы. Сакратар ЦК КПБ С. А. Пілатовіч, дырэктар завода І. М. Дзёмін, сталявар Герой Сацыялістычнай Працы Д. І. Барашкін віталі в'етнамскіх сяброў і ў іх асобе ўвесь гераічны в'етнамскі народ, гаварылі аб усенароднай падтрымцы яго барацьбы з амерыканскімі агрэсарамі.

На мітынгу выступілі таксама надзвычайны і паўнамоцны пасол ДРВ у СССР Нгуен Тхо Цян і намеснік міністра цяжкай прамысловасці ДРВ ВуАнь. Яны гаварылі пра тое, што народ В'етнама ўсім сэрцам радуецца поспехам беларускага народа ў будаўніцтве камунізма, што поспехі савецкіх людзей натхняюць іх на новыя працоўныя і баявыя подзвігі.

На мітынгу аднадушна была прынята рэзалюцыя, у якой аўтамабілебудаўнікі выказалі самыя шчырыя пачуцці дружбы гераічнаму в'етнамскаму народу і поўную салідарнасць з яго мужнай барацьбой супраць амерыканскіх агрэсараў.

Хвалюючым было наведванне в'етнамскай дэлегацыяй музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, дзе госці ўбачылі свяшчэнныя рэліквіі вялікай перамогі савецкага народа ў бітвах з фашысцкімі захопнікамі.

Госці даведваюцца, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны на часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі дзейнічалі дзесяць абласных, 185 міжраённых, раённых і гарадскіх камітэтаў КПБ, шмат тэрытарыяльных партыйных падпольных арганізацый. Больш як 25 тысяч камуністаў вялі за сабой армію народных мсціўцаў. Народныя мсціўцы вывелі са строю каля паўмільёна гітлераўскіх салдат і афіцэраў, пусцілі пад адхон больш як адзінаццаць тысяч варожых эшалонаў і 34 бронепаязды, знішчылі тысячы аўтамашын, танкаў, гармат і іншай тэхнікі.

Гасцям расказваюць, як з папялішчаў і руін узніміліся гарады і вёскі, адраджаліся заводы і фабрыкі, аднаўлялі работу школы і бальніцы...

...Так, лёсы нашых народаў пераклікаюцца: і беларусы і в'етнамцы прынеслі шмат ахвяр у імя свабоды і незалежнасці. Пра гэта думалі ўсе, хто прысутнічаў на ўскладанні в'етнамскімі сябрамі кветак ля помнікаў ахвярам фашысцкага тэрору пад Мінскам у Трасцянцы, дзе ў гады вайны размяшчаўся гітлераўскі лагер смерці, на вуліцы імя Талбухіна і ў Масюкоўшчыне.

Ахвяры, якія прынёс савецкі народ у мінулым, якія прыносіць в'етнамскі народ сёння — дзеля светлага радаснага дня, дзеля шчаслівых дзіцячых усмешак. Такіх менавіта ўсмешак, якімі сустракалі в'етнамскіх сяброў дзеці, што адпачываюць у піянерскім лагеры «Лясная казка».

У гэты дзень у лагеры яшчэ званчэй спявалі піянерскія горны, вышэй узляталі ў неба песні. Пра пачуцці ўсіх маленькіх гаспадароў лагера вельмі хораша сказала піянерка Рыта Ціванава:

— Над намі чыстае неба. Але не ўсе дзеці на зямлі жывуць цяпер так, як мы. Дзеці В'етнама змагаюцца разам са сваімі бацькамі супраць амерыканскай агрэсіі. І мы верым, што над В'етнамам таксама будзе чыстае неба, што над В'етнамам заззяе сонца свабоды.

Як сябры з сябрамі сустракаюцца працоўныя Беларусі з пасланцамі далёкага В'етнама. Вось некалькі паведамленняў, якія прыйшлі з розных куткоў рэспублікі.

Віцебск. Дэлегацыя Народных узброеных сіл Вызвалення Паўднёвага В'етнама, якую ўзначальвае Герой Арміі Вызвалення Паўднёвага В'етнама Чан Ван Дзінь, зрабіла паездку па горадзе. Вечарам у Палацы культуры бытавога абслугоўвання адбыўся ўрачысты сход грамадскасці Віцебска, прысвечаны савецка-в'етнамскай дружбе.

Цёпла і сардэчна прымалі пасланцоў гераічнага В'етнама — кіраўніка пастаяннага прадстаўніцтва Нацыянальнага фронту Вызвалення Паўднёвага В'етнама Данг Куанг Міня і суправаджаючых яго асоб Гомельшчына.

Па-брацку сустракалі в'етнамскіх сяброў працоўныя Брэста, Магілёва і Гродна.

Па матэрыялах БЕЛТА.

ТО ХЫУ

ЯК МАГУ Я СПАКОЙНЫМ БЫЦЬ

Я хацеў бы спакойна пісаць свае вершы,
толькі ж як я магу пісаць,
Калі словы ў радках спатыкаюцца, падаюць,
гнеўным агнём гараць!
Як спакойным быць, калі нават уночы
ныя сэрца ў сне,
Калі боль і трывога бесперастанна
грудзі сціскаюць мне!
О, які цудоўны заход свяціла,
як водар на золку плыве!
Як спакойны пунсовыя кветкі фыонга,
як конік стракоча ў траве!
Як вірує натоўп у гарачы летняй,
як шуміць, як кіпіць Ханой!
Але слухаю страшныя весткі з Поўдня,
і боль распаляецца мой.
Як спакойным быць, калі кожны стрэл,
што грымне ў той старане,
Б'е прамым попаданнем, без промаху б'е,
забіваючы радасць ва мне!
Вось зноў радыё будзіць мяне сярод ночы:
адгадваць даўно прывык —
Хто з блізкіх забіты, хто жывы яшчэ,
хто бясследна знік!
«Зноў у небе гул верталётаў —
устрывожан начны Сайгон:
На паўднёвым беразе высаджан новы
пяхоты марской батальён.
Зноў на захад ад старажытнага Хюэ
батальён зрабіў рывок.
Зноў з Поўдня даходзяць жахлівыя чуткі,
зноў кроў цячэ на пясок».
Як пісаць мне пра дрэвы, кветкі і птушкі,
пра духмяныя паплавы,
Калі дрыжаць ад паўднёвага ветру
нават сцяблінкі травы!
І калі я слухаю весткі з Поўдня,
я не сплю, не магу я спаць.
О зямля, што глыбока ўвайшла ў маё сэрца!
О нябёсаў блакітная гладзь!
О какосавых пальмаў паніклае лісце,
павароты знаёмай ракі
Там, дзе поначы ў джонках старую песню
на ловах пяюць рыбакі!
Чыя джонка плыве праз чарот асцярожна,
як цень па маўклівай рацэ,
Хто ў той джонцы стырно трымае,
а вінтоўку ў другой руцэ?
Гэй жа, сябар, падманлівы досвітак тут —
нячутна ўздымай вясло.
Ведай, лодачнік, наша адзінства, яднанне
на пасту узрасло.
Памажы нам, лодачнік, зноў вярнуцца,
ступіць на родны парог,
На зямлю сваю, да Духмянай рэчкі,
правяз праз чарот і трыснёг!
Памажы нам прычаліць да берагу Бо
ля схілаў Блакітных гор,
Памажы нам абняць сваіх мацерак
і суцешыць сваіх сясцёр,
Памажы нам дабрацца да варожага склада
і ўзарваць той склад,
Правядзі нас на сцежкі цясніны Хай-вана,
а вернемся самі назад.
Як малітву, тваё я імя шапчу,
о мой край, мой чарот!
Мой бясконца чароўны, казачны Поўдзень,
мой няшчасны і горды народ!
Там, дзе нашы атрады ішлі праз джунглі,
на схіле зарослай гары
У цішы навальнічнай там сёння дымяцца
разбітай базы муры.
Я гатовы да бою, пакут і смерці —
удар за удар! —
Калі напалам рассечаны бачу
маці-Радзімы твар.

Пераклаў Васіль СЕМУХА.

Аксель ШУЛЬЦЭ.

ПЛОЦЬ І ВОБРАЗ

Звычайны вераснёвы адвячорак.
Рабочы чалавек вярнуўся з працы
і, стомлены, памыцца не паспеў,
а ўжо ўключыў прыёмнік. Як звычайна,
навіны пачынаюцца з В'етнама —
напалм, ракеты, бомбы і ахвяры.

Я гавару з ахаладзелай плоццю,
юнацкай, распластанай ніц на бруку —
здабычай хіжых птахаў, варання,
неапазнаным безыменным трупам,
прыродай нежывой, што пастаянна
пераўтвараецца са стану ў стан
і не знікае.
Свінец — адна з прылад пераўтварэння
жывога ў мёртвае,
ператваральнік
крыві ў прыбыткі і свабоды ў рабства.

Асадак на вадзе, смуга на шкле —
уздзеянне свінца. Дзесь на задворках
раздаўся стрэл — сказаў сваё свінец.
Патронна-гільзавы завод Дэтройта
ліе кулі, каб ад іх лілася кроў.
Сайгон. Турэмны двор. Свінцовы слуп —
эмблема эскалацыі разбою.
Але і там, у гарадскіх прадмесцях —
мурашніках з гафрыраванай бляхі,
дзе ўсё прапахла сояй і цыбуляй, —
расце не бэз, не белы мак-відук,
там вырастае зброя, зброя гневу,
паўстанняў і асад.
На ўсіх халупах
шмаццё жалобы. Кожная сям'я
кагось аплаквае, і ў галашэннях
не роспач—заклік да жывых адпомсціць.

Не толькі душы, нават сухалес
кранае плач матуль, і кожны сук
перарастае ў піку, кожны ствол
прыцэльваецца ў змроку ў скронь забойцу.
Не трэск мембраны, а электраток
б'е ў вуха здраднікам па тэлефоне.
У падзямеллі затхлага КП,
прыкрыўшыся бранёю і «Майн кампфам»,
камандуе прадажны генерал
краінай, што не пад яго камандай
і над якою неба ад пажараў
трашчыць,
як перагрэтая патэльня,
і не сціхаюць чорныя дажджы
ад выбухаў надземных і наземных.

Ссінелы, набрынялы, бездыханны
ляжыць непахаваны сын В'етнама.
І ўсё ж ён не бясформенная плоць.
Яшчэ відны кадык, аблічча, рот,
і ён крычыць.
Вы чуеце! — крычыць
пакусаным, крывавым языком,
рассечанаю сківіцай варушыць,
хрыпіць раструшчаным ацёчным горлам.
Адкрытым позіркам вачэй журботных
глядзіць у вочы нашаму сумленню
ён, спалосаваны сталёвым дротам,
апалены, абліты кіслатой —
ён—непакорны сын свайго народа,
сын чалавецтва.
Глядзіць на нас усіх.
На нас,
На нас.

Пераклад з нямецкай мовы Язэпа СЕМЯЖОНА.

«МЫ — З КЕМЕРАВА»

1 ЖНІЎНЯ У МІНСКУ ПАЧНУЦЦА ГАСТРОЛІ КУЗБАСКАГА ТЭАТРА АПЕРЭТЫ.

Знаёмства рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва» з галоўным рэжысёрам тэатра аперэты Кузбаса Галінай Давыдаўнай Гагавай адбылося па тэлефоне: тэатр якраз заканчвае гастролі ў Ленінградзе. Яна расказала аб калектыве, аб яго рэпертуары, аб планах.

І вось на провадзе Ленінград.

— Ало, ало! Мы вас слухаем! Раскажыце пра будучыя гастролі, пра гастролі, якія прайшлі.

— Мы хочам танцаваць — пачулася ў адказ з Ленінграда. — Так, так, не здзіўляйцеся. Гэта назва аперэты, напісанай вядомым ленінградскім кампазітарам Андрэем Пятровым. Гэта аперэта, у якой многа танцуюць, ці балет, у якім многа спяваюць. Так аўтары твора вызначылі яго жанр. Дзеянне адбываецца ў тэатры аперэты, і героі п'есы — артысты. Само па сабе зразумела, што гэта нам блізка і дорага: па сутнасці, мы іграем саміх сябе. З гэтым спектаклем мінчане пазнаёмяцца ў час нашых гастролей. Рэпертуар тэатра разнастайны. У ім творы савецкіх кампазітараў, класіка, сучасныя заходнія мюзіклы. Вядома, у Мінск мы вязём далёка не ўсе спектаклі. Мы выбралі самыя цікавыя, якія вызначаюць аблічча нашага тэатра. Вельмі хочацца, каб патрабавальны мінскі глядач атрымаў найбольш поўнае ўяўленне аб нашым калектыве і, вядома, палюбіў яго.

Гастролі ў Мінску пачнём мюзіклам Ф. Лоу «Мая чароўная лэдзі». У апошнія гады гэты музычны твор заваяваў шырокую папулярнасць. Драматургічнай першакрыніцай яго з'яўляецца цудоўная п'еса Б. Шоу «Пігмаліён». Мінчане ўбачаць танцамна «Чорнага дракона» Д. Мадуньо. У нашым рэпертуары неўміручыя Кальман і Легар. Мы з радасцю пакажам сваю новую работу — «Кароль вальса» Іягана Штрауса. Прэм'ера гэтага спектакля адбудзецца ў Мінску.

Калі вы чыталі нашы афішы, якія, я думаю, ужо з'явіліся ў вас у горадзе, дык напэўна звярнулі ўвагу, што вядучае месца ў рэпертуары тэатра займае савецкая музычная камедыя. Апроч аперэты Андрэя Пятрова мы будзем іграць дзве часткі трылогіі А. Сандлера — «На досвітку» і «Чацвёра з вуліцы Жанны». Гэта — аб слаўнай Адэсе, аб дасціпных, вясёлых адэсітах, аб іх мужнасці, любві, песнях.

— Спадзяёмся, што вы не прымусіце нас круціцца ў крэслах і чырванець, калі на сцэне будуць прызнавацца ў каханні і рабіць выгляд, што ім вельмі весела зусім немаладым людзі.

— Наш тэатр вельмі малады. І не таму, што яму ідзе толькі дваццаць пяты год. Ён малады і па свайму творчаму складу. Магчыма таму нам лепш эксперыментаваць. Так, напрыклад, у аперэце «Мы хочам танцаваць» мы рызыкнулі і далі асноўныя ролі артыстам балета. Яны аказаліся здольнымі драматычнымі акцёрамі, спевакамі. Асабліва ўдала дэбютавалі саліст балета Іна Каделіна і Галіна Белякова. У час ленінградскіх гастролей у нас на спектаклі пабываў кампазітар Андрэй Пятроў. Мне здаецца, спектакль яго ўзрадаваў. І гледачам ён спадабаўся.

Я трошкі забегла наперад. Але як не падзяліцца ўражаннямі ад гастролей у такім цудоўным горадзе, як Ленінград, у горадзе, які славіцца выдатнай аперэтай, сваімі тэатрамі. У горадзе, які прымае ў сябе буйнейшых музыкантаў свету.

— На жаль, Мінск не вельмі песцяць цікавымі гастролямі.

— Разумею. Здаецца, у вас толькі што закончыў гастролі музычны тэатр з Палтавы. А цяпер яшчэ мы прыязджаем. Мне шкада, што многія лічаць аперэту лёгкадумным жанрам. Бо гэта не зусім так. Тут можна ставіць і вырашаць праблемы. Тут гэтак сама, як і ў драме, оперы, балеце, няма месца лёгкаважкасці, дылетантызму, пошласці, якія, на жаль, часам бяруцца на ўзбраенне замест сапраўднай музыкі і добрай драматургіі. Словам, нам хочацца даказаць, што аперэта — гэта сур'ёзна.

— І якія вашы поспехі?

— Мяркуйце самі. Калі мы ехалі ў Ленінград, нас страшылі: «Ленінградцы — народ спешчаны, які шмат пабачыў, і вам будзе цяжка». Выступаць нам давялося ў Вялікай зале кансерваторыі. 1 800 месц. Уяўляеце! І спачатку было туга. Спектаклі ішлі пры паўпустой зале. Траба аддаць належнае калектыву, што ён не ўдарыўся ў паніку і працягваў працаваць вельмі сур'ёзна. Ужо праз некалькі дзён, зала была поўная, а трошкі пазней з'явіліся жадаючыя набыць лішні білецік.

З рэцэнзіямі на нашы спектаклі выступалі «Ленінградская правда», «Вечерний Ленинград», «Смена», а ў эфіры прагучала 40-мінутная радыёрэцэнзія. Магчыма, пра гэта і не варта было гаварыць, але для ўсіх, хто працуе ў аперэце, добра вядома імя доктара мастацтвазнаўства М. Янкоўскага — дык вось ён якраз і выступіў па радыё з ацэнкай нашых спектакляў. Вельмі цікавай была і сустрэча нашых акцёраў з ім. Як вядома, прафесіянальны, сур'ёзны, добразычлівы разбор спектакляў, заўсёды надае сілы, абуджае думку — ён неабходны для творчага здароўя калектыву.

— Значыць, ленінградскі клімат аказаўся для тэатра спрыяльным?

— Вельмі. Нягледзячы на тое, што надвор'е стаяла дрэннае. Халадна. Дажджы...

Але вось ленінградскія гастролі заканчваюцца. Наперадзе Мінск. Наш калектыў едзе да вас у сталіцу Беларусі ўпершыню. Галоўны дырыжор нашага тэатра заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР Е. Лугаў, галоўны балетмайстар М. Громаў, хормайстар І. Юркевіч. Я некалькі гадоў працавала ў Мінску і добра ведаю, што глядач ваш патрабавальны і сур'ёзны. Я ведаю, што зусім нялёгка будзе нам заваяваць яго прыхільнасць, і ўсё-такі мы з радасцю едзем у ваш горад у гэты юбілейны для рэспублікі год.

Мы хочам танцаваць, мы хочам спяваць, мы хочам абуджаць у людзей самае лепшае, самае светлае. Мы хочам, каб пасля кожнага спектакля людзі станавіліся мысцейшымі, лепшымі, больш узвышанымі. Мы чакаем вас, дарагія мінчане, на нашых спектаклях, мы загадзя ўдзячныя вам за тое, што вы прыйдзеце.

Па тэлефоне.

ПАКАЗВАЮЦЬ В'ЕТНАМСКІЯ СЯБРЫ

Хыу ТХАНЬ. Поўдзень у жалобе, але поўны гераізму.

Даан ДАН. Народы ўсяго свету падтрымліваюць нас.
З выстаўкі в'етнамскага плаката.

СТВОРАНА ЦУДОЎНЫМІ МАЙСТРАМІ

У Дзяржаўным мастацкім музеі БССР разгорнута вялікая экспазіцыя сучаснага мастацтва В'етнама—жывапіс, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

Карціны (пераважна гэта пейзажы) выкананы ў традыцыйным для В'етнама стылі, які сённяшнія мастакі развіваюць досыць паспяхова. У аснове традыцыйнай тэхнікі—лак. Некаторыя творы — у тэхніцы масла. Як арганічныя выяўленчыя сродкі, у творах скарыстоўваюцца сусальнае золата, перламутр, шкарлупа яек. Свежасць фарбаў, ураўнаважанасць і прастата колерных рашэнняў — вось што прыцягвае ў творах в'етнамскіх пейзажыстаў. Яны адлюстроўваюць цудоўныя пейзажы краіны, якая сёння столькі цэрпіць ад бамбардзіровак амерыканскіх сцярвятнікаў.

На выстаўцы экспануюцца і шматлікія рэпрадукцыі малюнкаў, накідаў, партрэтаў, створаных непасрэдна ў месцах баёў патрыётаў В'етнама за сваю свабоду і незалежнасць. Гэта жывая хроніка барацьбы, якую вядзе народ, — хроніка, якая ўвойдзе яркай старонкай у летапіс гераічнай гісторыі В'етнама.

У спецыяльных вітрынах паказаны творы майстроў в'етнамскага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. І хоць гэтых экспанатаў параўнальна нямнога, яны нясуць яркі адбітак старадаўніх традыцый в'етнамскага народнага мастацтва, традыцый, якія сённяшнія мастакі паспяхова развіваюць і ўзбагачаюць. Матэрыялы гэтых твораў — самыя разнастайныя: розная саломка, дрэва, слановая косць, трыснёг. З гэтых матэрыялаў в'етнамскія ўмельцы ствараюць на дзіва лёгкія, чароўныя статуэткі, здольныя ўпрыгожыць любы інтэр'ер, бранзалеты і пацеркі, славутыя на ўвесь свет.

А разнастайныя шкатулкі, упрыгожаныя жывапісам, у аснове якога — лак! Альбомы, таксама распісаныя лакам. Гэта ўсё—цудоўныя ўзоры народнай творчасці.

Асобна хочацца адзначыць работы в'етнамскіх вышывальшчыц. Прастата, яснасць, гарманічнасць кампазіцыйных прыёмаў і колерных вырашэнняў робяць іх узорамі непаўторнага, адметнага мастацтва.

Выстаўка сучаснага мастацтва В'етнама ўвачавідкі пераконвае, што ў краіне, якая сёння вядзе барацьбу з ворагам за сваю свабоду і незалежнасць, паспяхова і творча развіваюцца даўнейшыя традыцыі, а на іх аснове ўзнікае новае, сапраўды сучаснае мастацтва, цесна звязанае з жыццём.

Н. СТРЫЖАК.

ЧАЛАВЕЧНАСЦЬ СУПРАЦЬ НЕЛЮДЗЯЎ

В'етнам... Гэтае слова — сімвал не толькі мужнай і самаахвярнай барацьбы, але і злачынстваў амерыканскіх забойцаў.

Мы сочым за поспехамі нашых братоў-в'етнамцаў у барацьбе і ў працы. Мы многае ведаем пра баявое жыццё ракетчыкаў Поўначы і партызанаў Поўдня, пра лясныя школы, пра падземныя заводы... Мы чытаем вершы в'етнамскіх паэтаў і чытаем кожную раніцу скупыя радкі тэлеграфных агенцтваў аб вайне, якая ідзе на в'етнамскай зямлі...

Гэтымі днямі ў Мінску, у Мастацкім салоне-магазіне мы атрымалі магчымасць бліжэй пазнаёміцца з такім дзейсным відам зброі патрыётаў В'етнама, як палітычны плакат.

Першае ж, што ўражвае на гэтай выстаўцы, — магутнае гучанне фарбаў, выразнасць кампазіцыйных вырашэнняў плакатаў, аптымізм — і ў тэматыцы, і ў змесце. Тут — не злосць, а гнеў, не жах, а абурэнне, не надзеі, а перакананасць у перамозе.

«Я не знаўца мастацтва, — гаварыў ва ўступным слове, адкрываючы выстаўку, пастаянны прадстаўнік Нацыянальнага фронту Вызвалення Паўднёвага В'етнама Данг Куанг Мінь.—І я не ведаю, як меркаваць пра плакаты з пункту погляду мастацтва. Але я ведаю, што мастакі стараліся выказаць нашыя пачуцці і што гэтыя плакаты памагаюць нам ваяваць».

Майстэрства в'етнамскіх мастакоў не можа не выклікаць павагі. Гэта майстэрства палымяна выказваць думку. Надоўга запамінаюцца такія плакаты, як «Кліка ЗША — Дзьем разбурыла шчасце» мастака Фама або «Поўнач і Поўдзень — адзінае цэлае» мастака Хуанг Чама.

У плакатах, паказаных на выстаўцы,—усе асноўныя бакі жыцця гераічнай краіны. Тэматыка — ад выкрыцця марыянетачнага рэжыму Паўднёвага В'етнама да гаспадарчых праблем краіны. Тут няма плакатаў, якія адразу б не ўспрымаліся ясна. Лаканізм і даходлівасць думкі — вось асноўныя вартасці такіх работ, як, напрыклад, «У пачуццях, якія аб'ядноўваюць Поўнач і Поўдзень, няма дэмаркацыйнай лініі» Май Ван Нанга. Па яркім контуры В'етнама — з поўначы на поўдзень ідзе лінія электраперадачы. Зверху—яснае неба. Знізу — зеляніна. І больш нічога... Адзінства краіны патрэбна, як паветра. Толькі такая думка выразна «чытаецца» ў гэтым плакаце.

Уражваюць па-майстэрску выкананыя плакаты «Павярніце ружжы, страляйце ў кліку ЗША—Дзьем!» Куанга Тхо і «Мама, о мама!» Нгуен Хіеу. На апошнім—жах дзяўчынкі перад бомбай.

Беларусы добра ведаюць, што такое вайна. І мы цудоўна разумеем пачуцці народа, якія выяўлены і ў творах в'етнамскага плакатнага мастацтва.

Актыўна скарыстоўваюць в'етнамскія плакатысты сродкі гратэску, сатыры. Вось плакат Нгуена Знанга «Тут свабода, свабода!»—гэта крычыць марыянетачны дыктатар, у раззўленай пашчы якога бушуе пажар смерці і падаюць бомбы... А побач кплівы плакат «Вашынгтон — Сайгон, Сайгон—Вашынгтон» Гуанга Вана. Тут на В'етнам ляцяць чорныя сцярвятнікі амерыканскіх ваенна-паветраных сіл, а назад вяртаюцца труны з крылцамі з нацыянальнага сцяга ЗША...

Пра мару народную аб светлым заўтра, аб тым, якім павінна стаць жыццё пасля перамогі, расказваюць плакаты Хоаг Хонг Хака і Туан Зоанга.

...Над чарцяжом схілілася юная дзяўчына, а за ёю відаць светлы будынак, які яна хоча ўзвесці на месцы руін, І—подпіс: «Вуліцца дзеля будучыні роднай маці-краіны!» Пяшчотныя акварэльныя фарбы ў плакаце «Я пакажу гэта маме ў дзень уз'яднання».

А якія цікавыя аплікацыі Ван Да «Няхай жыве перамога Ап-Бак!» і Тоу Цьема «Мы ідзём наперад. Нішто не здольна нас раз'яднаць!»

Багата прадстаўлена побач з плакатам і палітычная карыкатура сённяшняга В'етнама. Дасціпнасць, прастата малюнка, рэалістычная манера ставяць в'етнамскую карыкатуру ў адзін рад з лепшымі дасягненнямі сучаснай сатырычнай графікі.

У экспазіцыю ўвайшлі і рэпрадукцыі в'етнамскай скульптуры. Пераважна гэта манументальныя самабытныя творы, складаныя па кампазіцыі, разнастайныя па манеры выканання. Яны хвалююць пачуццямі мужнасці і непакорнасці ворагу, перададзенымі ў іх.

Гэтая выстаўка не толькі пашырае наша ўяўленне аб жыцці сённяшняга В'етнама, аб яго барацьбе. Гэта сустрэча з сапраўдным мастацтвам. Арыгінальнасць кампазіцыйнага мыслення, добрае валоданне колерам — несумненныя ў паказаных творах. А галоўнае—вера, непахісная вера ў Перамогу. І мы, гледачы, гэтую веру падзяляем.

К. ЯДВІГА.

АБ'ЕКТЫЎ РАСКАЗВАЕ ПРА МАГІЛЁЎШЧЫНУ

З АБЛАСНОЙ ВЫСТАЎКІ МАСТАЦКАЙ І ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ФАТАГРАФІІ

У МАГІЛЁЎСКАЙ вобласці стала традыцыйнай штогод праводзіць у гарадах і раёнах выстаўкі дакументальнай і мастацкай фатаграфіі. Радасна, што з кожным годам расце колькасць фотааматараў і фатографаў-прафесіяналаў, якія ўдзельнічаюць у гэтых выстаўках.

На нядаўна адкрытую абласную выстаўку мастацкай і дакументальнай фатаграфіі «Мая Магілёўшчына», прысвечаную 50-годдзю БССР і Камуністычнай партыі Беларусі, было выбрана для паказу каля дзвюхсот работ прыкладна паўсотні аўтараў.

Сярод удзельнікаў выстаўкі і такія майстры, як фотакарэспандэнт фотахронікі БЕЛТА Мікалай Жалудовіч, фотакарэспандэнт абласной газеты «Магілёўская праўда» Анатоль Борчык, тэхнолаг Магілёўскага аўтамабільнага завода Аляксандр Сідлераў, мастак-афарміцель Павел Цішкоўскі, і зусім юныя фотааматары—гурткоўцы Магілёўскага і Бабруйскага дамоў піянераў і школьнікаў.

Здымкі, якія экспануюцца на выстаўцы, прысвечаны нашай сучаснасці, расказваюць аб жыцці і працы савецкіх людзей—рабочых і калгаснікаў, дзеячоў культуры, апяваюць прыгажосць роднага краю. На выстаўцы—тры раздзелы.

Першы — «Народная гаспадарка» — больш пяцідзесяці фотаработ, якія цікава адлюстроўваюць індустрыялізацыю вобласці.

Перадавікі працы ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы, будаўнікі прамысловых прадпрыемстваў і ўстаноў культуры, розныя моманты працы на фабрыках і заводах прыцягваюць пільную ўвагу фотамайстроў вобласці. Захапляе здымак Аляксандра Сідлерава «Прафесія смелых». Тут адлюстраваны момант работы верхалазаў-мантажнікаў на будаўніцтве Магілёўскага камбіната штучнага валакна. Прыцягваюць увагу наведвальнікаў работы Юрыя Лыскова, Аляксандра Далініна, Лукі Брытко, Р. Ганікмана, у якіх адлюстравана будаўніцтва ў Бабруйску, Крычаве, сельскагаспадарчыя работы ў розных калгасах вобласці. У гэтым жа раздзеле выстаўкі шырока паказаны партрэты знатных людзей Магілёўшчыны. Вельмі эмацыянальны партрэт ветэрана аховы здароўя — хірурга С. Ільіна работы Зіновія Шагельмана. Хірург схіліўся над апарацыйным сталом. Самога стала ў кадры няма, але мы адчуваем змаганне хірурга за жыццё чалавека, адчуваем што гэтае змаганне будзе выйграна. Сярод удач у партрэтным жанры — здымак токара Магілёўскага паравознага дэпо Лаўрэнцева (работа Адама Рагоўскага), здымак Героя Сацыялістычнай Працы слесара А. Гарбацэвіча (работа Мікалая Жалудовіча). Вельмі выразны твар пажылога мужчыны(здымак Аляксандра Бязручанкі) у рабоце «Мой сусед». Такія здымкі — быццам навелы пра людзей працы.

У раздзелах выстаўкі «Прырода Магілёўшчыны» і «Культура, асвета, ахова здароўя, спорт, побыт і адпачынак працоўных» — шмат работ, якія яскрава сведчаць пра клопаты партыі і дзяржавы аб савецкім чалавеку, шмат маляўнічых пейзажаў.

Як звычайна, радуе сваімі пейзажамі Аляксандр Сідлераў. Яго работы «Палі родныя», «У бары Любужскім», «Дарогі Магілёўшчыны» — лірычныя, насычаныя святлом і цяплом, прыцягваюць сакавітасцю выканання, умельствам бачыць светлавую гаму прыроды.

Добрыя пейзажы паказалі і іншыя аўтары. Лепшыя з іх — «Дождж» і «Восень» Зіновія Шагельмана, «Ледаход на Дняпры» і «Верасень» Паўла Цішкоўскага, «Раніца» і «Дубовы гай» Аляксандра Даліміна, «Цвітуць каштаны» Вікторыі Цішкоўскай.

Названыя работы сведчаць пра ўмельства іх аўтараў назіраць родную прыроду, пра валоданне сакрэтамі паэзіі фотамастацтва.

Сярод жанравых здымкаў лепшыя тыя, дзе аўтары імкнуцца паказаць жыццё савецкіх людзей у яго будзённых праявах.

Усеагульнае захапленне выклікае работа М. Гародкіна і Г. Дурца — выхаванцаў гуртка фотааматараў Бабруйскага Дома піянераў (кіраўнік Р. Гацман), якая называецца «Бязважкасць». Гэта знятыя ў непрывычным ракурсе немаўляты, якія быццам бы ў бязважкасці, у незвычайных для іх узросту позах. Здымак выклікае асацыяцыі сапраўды «касмічныя»: мы не ведаем, ці стануць гэтыя малыя, калі вырастуць, касманаўтамі, але ўсёй душой адчуваем, што іх чакае светлая будучыня.

Цікавая і работа Паўла Цішкоўскага «Сонечныя струмені». У гарачы летні дзень дзяўчынкі гуляюць са струменьчыкамі фантана, якія пераліваюцца на сонцы і нібы ператвараюцца ў праця́г сонечных праменняў...

Дзякуючы творчасці ўдзельнікаў фотавыстаўкі «Мая Магілёўшчына», складваецца ўражанне аб сённяшнім дні вобласці. І ўражанне гэтае досыць усебаковае.

Думаецца, што гэтая выстаўка — сапраўдная творчая ўдача вялікага калектыву фотамастакоў і фотарэпарцёраў.

З. ЛЫСЕНКА.

НАРОДЖАНЫЯ З ПЕСНЯЙ

КАБ ХЛЕБ НЕ БЫЎ ГОРКІМ

Ды пара дамоў, пара,
Ужо зара зарылася,
Я дамоў спазнілася.

(Запісана ў вёсцы Пожарцы са слоў Паўліны Новік).

ВЕСКА здавалася бязлюднай. Быў яркі сонечны дзень. Цвіла бульба, гарэлі гваздзікі, ружавелі півоні. Калодзежныя жураўлі з зайздрасцю ўглядаліся ў неба на жураўлёў жывых, якія ўмелі лётаць. У паветры стаяў рэзкі пах гною, сырадою, траў... А людзей не было. Усе яны знаходзіліся на полі: гарачая пара — касьба.

Я іду па вёсцы і шукаю дом, пакрыты шыферам. Гэта дом Івана Іосіфавіча Міцкевіча — аднаго з жыхароў Пожарцаў, цымбаліста. Мы сустрэліся з ім у кабінеце старшыні калгаса і дамовіліся, што я буду чакаць яго ўвечары ў вёсцы. Ён паспеў мне толькі сказаць, што дом яго пад шыферам, і я лёгка яго знайду.

Аказваецца ў вёсцы ўсе дамы (а іх 35—40) пакрыты шыферам. Але ўсё-такі я знаходжу хату Івана Іосіфавіча. Адразу адчуваю па нейкіх няўлоўных дэталях, што жывуць тут шчырыя людзі. Па тым, як прыбрана хата і як цябе запрашаюць прайсці, як адчынены дзверы і як з першага слова цябе разумеюць... Мяне сустрэла чысценькая, я б сказала, прыгожая бабуля Таццяна Марцінаўна. Яна смела прызналася, што ёй, па яе падліках, 82 гады, але людзі кажуць, што больш. Ёй, вядома, усё роўна, але злосныя языкі заўсёды хочуць перабольшыць узрост жанчыны. Потым яна з задавальненнем расказала пра ўнукаў, у якіх вельмі добрыя вушы, чуюць усё і ўсялякую музыку напамяць ведаюць, расказала пра калгас, у якім, дзякаваць богу і Савецкай уладзе, усё ёсць.

Я была рада сустрэчы з Таццянай Марцінаўнай. Нечым яна нагадвала мне бабулю-гаспадыню, у якой мы пасяліліся ў час эвакуацыі ў гады вайны. Яна ведала тысячы казак. І расказвала іх кожны вечар на працягу многіх гадоў. Казкі былі дзівосныя. Многія запомніліся на ўсё жыццё. Гледзячы на Таццяну Марцінаўну, я падумала, што зараз і яна пачне расказваць казкі. Але яе стыхія была іншая — песня.

— Як стане маркотна, дык я папрашу ўнучку Ванду, каб пайграла. І адразу весялей робіцца. Умее і на цымбалах, і на гармоніку добра і на лыжках. Вось зараз прыйдзе, паслухаеце. Калі чалавек грае ці спявае,—ён добры чалавек. Без песні нельга. О, чуеце, чуеце,— раптам сказала яна, — певень спявае, конікі таксама. Нават дрэвы спяваюць...

Яна цяжка ўздыхнула.

— Жыла тут непадалёку Паўліна Новік, 86 гадоў жыла на белым свеце. І ўсё пяяла. Пяяла, як жыта жала, пяяла, як унучак замуж аддавала. Прыгожа пяяла, бясконца. І ўсё розныя песні. І святыя, і пустыя. Усё напамяць пяяла, а літары ж ніводнай не ведала. А ёй і не патрэбна было, да яе і так людзі з даверам ішлі. Вялікі чалавек была Паўліна Новік. Калі яна памірала, дык уся вёска каля яе была. Ёй ужо і не страшна было паміраць, бо песні свае яна спела і іншых навучыла.

Таццяна Марцінаўна змоўкла, а потым заспявала ціха, працяжна, задушэўна:

Ды пара дамоў, пара,
Ужо зара зарылася.
Я дамоў спазнілася.
Згубіла зара ключыкі.
За ёй месячык пайшоў.
Яе ключыкі знайшоў.
Месячык, мой брацятка,
Аддай мае ключыкі,
Зямельку адмыкаці,
Расіцу выпускаці.
Расіцу, расіцу
На зялёну травіцу.
Расіца сцюдзёная,
Трава зялёная...

Як нараджаецца песня — ніхто не ведае. У такіх песень сотні аўтараў. Гэтую песню спявалі, відаць, яшчэ дзяды Паўліны Новік. Можа інакш, не так, як яна, бо яна арасіла яе сваім талентам, асвятліла мудрасцю...

Мы сядзім на ганку, перад намі рассцілаецца поле і неба. Аднекуль нечакана вырасла жанчына: загарэлая, босая, у вузкай чорнай сукенцы. Пакланілася нам і спынілася. Даведаўшыся пра мэту майго прыезду (напісаць, як любяць у Пожарцах песню, пра цымбалістаў, пра тых, хто робіць цымбалы), яна неяк нядобра паглядзела на нас і, скрыжаваўшы рукі на грудзях, прахрыпела:

— Жыць можна і без вашых цымбалаў, вось без хлеба жыць нельга. Ці чулі вы, каб мужыкі на цымбалах трымкалі? Расфуфырацца, у горад паедуць паказвацца. А ў горадзе і без цымбалаў усяго хапае: там і артыстаў шмат, і кіно, і тэлевізары...

Таццяна Марцінаўна неяк пастарэчы застагнала, а потым сышла з ганка, заняла сваю «пазіцыю» супраць жанчыны і сярдзіта сказала:

— Брэшаш, без песні ворага не адолееш, хлеб горкім будзе і жыццё сумным. Ты гэтага не разумееш і таму жыць табе цяжка. Нельга так.

— Во, бачылі, — наступала жанчына, — Атлусцелі. Хлеба нажэрліся.

Але Таццяна Марцінаўна ўжо сядзела на ганку і ніякай увагі на яе не звяртала. А калі тая пайшла, сказала:

— Усё жыццё толькі і робіць, што грошы збірае. Сын быў — не вытрымаў, пайшоў ад яе. Жыве адна: ні сабе, ні людзям...

НЕ ЦЫМБАЛЫ — БАГАЦЦЕ...

Так на хрэсьбінах людзі
Назвалі цымбаламі іх.
Быццам рэха па хаце
Ішло ад сцяны да сцяны:
— Не цымбалы, багацце...
— Багацце!
— Няма ім цаны.
З хаты ў хату імкліва
Разнеслася слава сама.
Не цымбалы, а дзіва...
А дзіва!
Цаны ім няма!
А. Куляшоў. «Прыгоды цымбал».

ІВАН Іосіфавіч вярнуўся, калі сонца ўжо заканчвала работу на гэтай палавіне зямлі і адыходзіла на другую. Ён памыўся, хуценька пераапрануўся, паставіў на стол цымбалы і зайграў. Цымбалы то гаварылі чалавечым голасам, то спявалі, як птушкі, то шумелі, як лясы...

— Колькі помню сябе, іграў на цымбалах.

Іван Іосіфавіч прысеў на беражок крэсла, паклаў рукі на калені. Рукі былі вялікія, моцныя, вузлаватыя.

— Дзед вельмі строгі быў. Не так граеш, дык ён як дасць па руках смыком. Сам ён больш на скрыпцы любіў. Помню, вельмі мяне ўразіў смык — доўгі-доўгі. Умеў ён рабіць і смык, і скрыпку, і цымбалы. Такі гук здабываў, як ніхто. Ну, дык вось, значыць, граў я з дзяцінства. А пазней, ужо ў трыццаць дзевятым, калі арганізавалі ў нас чырвоныя куткі, дык я з сябрам сваім Станіславам Мелецам усялякія песні граў. Помню «Чорныя вочкі», «Едуць з поля трактарысты». Вельмі запамінальныя мелодыі... А якія цымбалы рабіў дзед! Яны ў музеі захоўваюцца. У нас у Пожарцах і сёння не перавяліся людзі, якія ўмеюць рабіць цымбалы. Жыве ў нас Іосіф Новік, дык ён нарабіў цымбалаў амаль для ўсёй нашай вёскі. Вы ж, відаць, ведаеце, што тут у нас ансамбль цымбальны створаны. Амаль ад кожнай хаты прадстаўнік ёсць. Калі не мужчына, дык жанчына. Першы час ім кіраваў наш загадчык клуба Крывенка. Вось ён мне неяк і кажа: трэба сына вучыць на цымбалах. Ну, я прыйшоў дадому і кажу Янаку, сыну, значыцца, яму тады было 11 гадкоў: «Янка, будзеш вучыцца граць». Даў яму цымбалы, палачкі, паказаў як іх трымаць — і ён давай імі біць. А дачка Вандзячка зусім яшчэ маленькая была, у школу нават не хадзіла, слухала, слухала, а потым таксама граць пачала. Так мы ўтраіх пачалі хадзіць на рэпетыцыі. А неяк наш кіраўнік і кажа: «Трэба табе жонку падсадзіць. Цэлая сям'я будзе. Выбірай каго-небудзь з аркестра». А я і кажу: «Навошта ж мне чужая, я і сваю навучу». І навучыў сваю законную — Марыю Ігнатаўну. Калі мы на раённым аглядзе выступілі, дык нам так «біс» білі — ой-ей-ей. Толькі потым канфуз атрымаўся, калі мы ў Мінск прыехалі. Вандзячка адна павінна была выступіць. Ну, пачала граць і раптам нешта здарылася. Не грае дачушка. Думаю, што там такое, а потым здагадаўся: гузічак ад рукава паміж струн залез і яна рукой варушыць не можа. Узляцеў я на сцэну, адарваў гузічак і пачала яна граць. Уся зала стоячы пляскала ў далоні.

І ён зноў зайграў.

Я не заўважыла, як набілася поўная хата людзей. Уздоўж сцяны на лаве сядзелі пажылыя мужчыны і трошкі маладзейшыя. Вытрашчыўшы вачаняткі, забыўшыся пра ўсё на свеце, стаялі дзеці. Таццяна Марцінаўна была таксама тут.

Чорная ноч, прыпаўшы да шыбаў, слухала. Калі Іван Іосіфавіч закончыў граць, усе сталі прасіць сыграць Лёньку — так прывыклі ў вёсцы называць, хоць і паважаюць, любяць чалавека, старога Лявона Іванавіча Мелеца. Ён доўга не згаджаўся, маўляў, на чужых цымбалах не пойдзе.

— Я настройшчык. Вось зробяць новыя цымбалы, а я іх зваджу. Адны звяду і зноў новыя зваджу.

Нехта з дзяцей крыкнуў:

— Ён яшчэ на дудцы ўмее.

— Праўда, і на дудцы граў. Толькі дзяўчаты кажуць — хто ў дудку дзьме, той мала жыве. Ну, а каму ахвота мала жыць? Усім хочацца многа жыць. Вось я і пачаў на цымбалах граць.

Ён павольна набіў люльку, зацягнуўся, узяў палачкі, дакрануўся да цымбалаў, нібы заігрываючы з імі, і цымбалы адказалі яму. Яго памяць захоўвала мноства мелодый роднага краю. Гэта з яго памяці запісаны і выконваюцца цымбальным аркестрам вёскі Пожарцы сюіты, мазуркі, народныя песні і танцы. Цяпер ён выконваў жартоўтую польку «Гуся-Сюся».

А потым гралі і Янак, і Станіслаў Мелец, і Марыя Ігнатаўна — жонка Івана Іосіфавіча...

Ад пакалення да пакалення, як эстафету, перадаюць у Пожарцах цымбальныя палачкі.

ПЯВУЧАЕ ДРЭВА

Сярод сясцёр вясёлых
Яна ў бары расла.
Вышэйшаю між ёлак,
Гучнейшаю была.
. . .
Не плачце! — прашумела,
Як падала ў траву, —
Я буду пець.
Як пела.
Я вас перажыву.
А. Куляшоў. «Прыгоды цымбал».

ІОСІФ Мікалаевіч Новік не можа сказаць, калі пачаў рабіць цымбалы, ён не можа сказаць, хто яго навучыў. Правільней гаворачы — заўсёды ўмеў, усе навучылі...

Ды і рабіць іх аказваецца проста. Трэба толькі ўмець. Добра спявае елка-старалесіна — так называюць яе ў народзе. А з елкі трэба выбраць самыя драбнаслойныя месцы. Выпілаваць дошчачкі, склеіць. Добра, калі ў елку гэтую гром ударыў, тады яшчэ лепш цымбалы спяваць будуць. А яшчэ — каб вушы добра чулі, ды рукі былі добрыя. Відаць, Іосіф Мікалаевіч ведае яшчэ сакрэты, але не гаворыць. Каб пра той сакрэт даведацца, трэба не адны цымбалы зрабіць і нямала поту праліць. І любоў патрэбна вялікая і талент.

Я ўспомніла, як упершыню пачула пра Івана Іосіфавіча і вясковы ансамбль. Гэта было зімою ў Віцебску. Тады мне расказалі, што ў ансамблі з Пожарцаў 45 чалавек і кіруе імі Якаў Паўлавіч Нікіцін. Яны ўжо выступалі на раённых, рэспубліканскіх аглядах мастацкай самадзейнасці і нязменна ім спадарожнічаў поспех. Якаў Паўлавіч — выкладчык музычнага вучылішча ў Віцебску — часта бывае тут. Справа не абмяжоўваецца рэпетыцыямі. Аркестр выконвае толькі «сваю» музыку. Таму вельмі часта Якаў Паўлавіч і яго аркестранты накіроўваюцца па вёсках, збіраюць мелодыі, запісваюць іх на магнітафон.

Мне не давялося пачуць увесь аркестр, калі ён на сцэне і калі ў зале гледачы. Думаю, што гэта цікава... Цікава таму, што ансамбль з Пожарцаў — не тая самадзейнасць, куды адзін прыходзіць з любві да мастацтва, другі — ад няма чаго рабіць, а хтосьці за кампанію з сяброўкаю. Тут песня і музыка —натуральная патрэба, спадчына багатага і таленавітага народа — дзецям, унукам. У Пожарцах іграць і спяваць — гэтак жа, як сеяць жыта.

І. ПІСЬМЕННАЯ,
спец. карэспандэнт «Літаратуры і мастацтва».
Пастаўскі раён.

ПЯЛІШЧАНСКІЯ НАПЕВЫ

...Пялішчанскі хор... Пялішчанскі танцавальны ансамбль. Гэтыя назвы добра вядомы аматарам самадзейнай сцэны Брэстчыны. У мінулым годзе на абласным аглядзе Пялішчанскі калектыў самадзейнасці заняў трэцяе месца. Ганаровае месца, калі ўлічыць, што ён існуе другі год. Кіруе калектывам Яўген Браніслававіч Гамзюк. За два гады гэты энтузіяст здолеў арганізаваць самадзейны калектыў, які налічвае ў сваіх радах больш за сто пастаянных удзельнікаў. Але справа не толькі ў колькасці. З кожным годам расце і майстэрства выканаўцаў. У мінулым годзе пялішчанскія танцоры выступалі ў Польшчы, у горадзе Бяла-Падляску, за што былі ўдастоены крыштальнай вазы польскіх сяброў.

Вялікі клопат аб самадзейным калектыве праяўляе праўленне калгаса «40 год Кастрычніка» Камянецкага раёна.

— Летась праўленне гаспадаркі,—гаворыць старшыня арцелі Мікалай Іларыёнавіч Ляшук,—на набыццё насціюмаў для танцораў і харыстаў асігнавала 4 000 рублёў. У хуткім часе набудзем інструменты для эстраднага аркестра.

У гэтыя дні калектыў настойліва рыхтуецца да 50-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі. Распрацаваны і прыняты «да вытворчасці» сцэнарый канцэртнай праграмы «Мы—беларусы». У яго ўвайшлі песні, вершы, інтэрмедыі, урыўкі прозы і танцавальныя нумары беларускіх аўтараў.

У хуткім часе новая праграма будзе паказана на раённым аглядзе калектываў мастацкай самадзейнасці.

І. ДАШЧЫНСКІ.

ПА РОДНЫМ КРАІ

Пачаліся гастролі Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра па родным Прынёманскім краі. Пры тэатры створаны тры акцёрскія брыгады: першая—удзельнікі спектакля «Перабежчык» па п'есе Пятра Арыядны Тур, другая—«Вясельнае падарожжа» Уладзіміра Дыхавічнага, трэцяя—«Цвыркун, ці бюро добрых паслуг» Тадэуша Кажушніка.

Гастролі працягнуцца месяц. За гэты час калектыў пакажа сто спектакляў для жывёлаводаў, паляводаў, механізатараў. Артысты ўжо выступалі ў Карэліцкім, Навагрудскім, Смаргонскім раёнах.

Ул. ДЗЕМІН.



П. Цішкоўскі. Сонечныя струмені.
З Магілёўскай абласной фотавыстаўкі.

ТУТ ПРАЦАВАЎ ЯКУБ КОЛАС

Відаць, мала хто з чытачоў нашай рэспублікі ведае, што ў свой час у нашых мясцінах, у былой Абчугскай воласці, працаваў настаўнікам народны паэт Беларусі Якуб Колас. Чамусьці сталася так, што гэтая старонка біяграфіі песняра не прыцягнула пільнай увагі даследчыкаў - коласазнаўцаў. А між тым...

У аўтабіяграфіі, датаванай 1926 годам, Якуб Колас пісаў: «У пачатку 1908 года паехаў у Магілёўшчыну ў адну школу, адкрытую панам Гардзялкоўскім. Матэрыялам для навучання чытанню была «Наша ніва» і невялічкая літаратура, якую можна было дастаць тады».

Гэтыя скупыя радкі зацікавілі ўдзельнікаў літаратурнага гуртка нашай школы і мяне як кіраўніка гуртка і выкладчыка роднай літаратуры. Неўзабаве мы прачыталі артыкул С. Александровіча ў газеце «Літаратура і мастацтва», у якім паведамлялася, што Я. Колас у дарэвалюцыйны час працаваў настаўнікам у былой Абчугскай воласці. Мы вырашылі абавязкова наведаць тыя мясціны, дзе шэсцьдзесят гадоў назад народны пясняр сеяў «разумнае, добрае, вечнае».

Надышло лета. На чале групы вучняў я пайшоў у паход. Мы наведалі вёскі Габрылёва, Папоўку, Плоскае, Сані. Менавіта ў Санях, як паведамляў С. Александровіч, працавала ў 1908 годзе школа з беларускай мовай навучання, у якой настаўнічаў Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч. На жаль, звесткі, якія мы сабралі, былі скупыя. Ні ў адной з гэтых вёсак мы не знайшлі былых вучняў Я. Коласа.

Але пошукаў мы не спынілі.

Аднойчы дзесяцікласнік Мікалай Шышко прынёс радасную навіну—знойдзены былы вучань гэтай школы. Мы адразу ж напісалі Фёдару Ларыёнавічу Жураўлёву ліст—у вёску Відзінічы Талачынскага раёна. Неўзабаве прыйшоў адказ. Фёдар Ларыёнавіч паведамляў, што ён сапраўды вучыўся ў Канстанціна Міхайлавіча, што, больш таго, школа месцілася ў хаце ягонага бацькі.

«Была справа так,—пісаў Ф. Жураўлёў.—У 1908 годзе я вучыўся ў царкоўна-прыходскай школе ў вёсцы Плоскае. Разам са мной у чацвёртым класе вучылася яшчэ хлопчыкаў 10—11. Клас рыхтавалі да экзаменаў. Галоўным кіраўніком школы быў поп. У маёнтку Папоўка жыў пан Гардзялкоўскі, дэмакрат. Ён прыехаў у Сані да майго бацькі і дамовіўся, каб той пусціў

СЯРОД КНІГ

ТОЛЬКІ Ў ЖЫЦЦІ

НЕ. ДЗІЎНЫ ён ўсё-такі паэт, Рыгор Барадулін!

Чытаеш верш, другі, трэці... дзесяты. Усё неяк у роскід, у разнабой: конікі, матылі, ільдзінкі, бульбоўнік, маланкі. Шукаеш гэту — як яе? — «руководящую нить». Няма. А яшчэ і крытыкі (ў тым ліку і аўтар гэтых радкоў) сігналізуюць трывожна: роздуму мала, мала «ідэі». Чытаеш далей: сапраўды малавата. Усё больш уражанняў, карцін, назіранняў... «Я гэты ціхі дым на смак і навобмацак ведаю»... Ён мог бы гэтак жа сказаць не толькі пра дым — пра цэлы свет. Пра жыццё.

У Барадуліна ёсць найважнейшая для паэта якасць: уважлівасць і цікавасць да ўсёй шкалы рэальных жыццёвых каштоўнасцей. Тут, калі хочаце, яго канцэпцыя, яго ідэя. Мы цэнім ідэі, калі яны сфармуляваны. «Разлітыя» ў гуках, колерах і аб'ёмах, яны не заўсёды да нас даходзяць. Між тым сіла Барадуліна якраз у гэтым умельстве адчуць і перадаць у слове шматколернасць, рознамаштабнасць і «важкасць» усяго, што акаляе кожнага з нас і што складае паняцце жыцця ў сэнсе **вопыту**, кожнаму з нас даступнага.

Кніга «Адам і Ева» — выбранае Р. Барадуліна. Па ёй можна прасачыць больш чым дзесяцігадовы шлях паэта, але рабіць гэтага не будзем—лепш пагаворым пра тое, што адстаялася як «натура», як душэўны здабытак і для самога аўтара, і для нас, яго чытачоў.

Дык от, конікі, матылі, навальніцы, поплаў, мох баравы... Нельга не палюбіць увесь гэты цёплы, звонкі і шчодры свет Барадуліна, што **сам па сабе**, а не як прычына для глыбакадумных разваг увайшоў у вершы паэта — звонкія, пахкія і празрыстыя, як луг і рака...

Можна бясконца, да хрыпаты, спрачацца аб «асацыятыўным вершы», аб «межах наватарства» і г. д. Пустыя спрэчкі, бо пошук не мае межаў, абы толькі ён рэалізаваўся на грунце жыцця і паэтавай **непасрэднай** думкі аб ім.

Калі ў паэта ёсць такая непасрэднасць, калі ён не выдумляе «эфекты», тады не здадуцца нацяжкай нават самыя нечаканыя пераўтварэнні рэальнага. Як, скажам, у таго ж Барадуліна:

Матылёк на калені прысеў,
Раскрыліў крылы:
Два заспаных лугі ў расе,
Дзве аблачынкі-крыгі...

Ці пра стэпавую сухмень і смагу, калі ў арла «рассохлася дзюба», а «суслік моліцца, склаўшы лапы». Альбо пра белыя ночы ў Ленінградзе: «Белыя ночы—ці гэта блукае белы мядзведзь на полюсе?»

Лепш за многіх сваіх равеснікаў Барадулін адчувае першаснасць, свежасць і чысціню таго, што ён бачыць і чуе, пра што расказвае ў вершах. І гэта ўжо датычыць не толькі прыроды, але і чалавека сярод прыроды. Як, напрыклад, у гэтых радках, праўдзіва **народных**, бо за імі не толькі народная песня, а і цэласна-ідэальнае ўяўленне пра душэўнае і прыгожае:

Мохам зязюльчыным
ідуць маладзіцы,
Губы засмяглыя
ў спелых суніцах—
На сонцы ягады
спакойна вымлелі.
Холадам ногі
рачулка вымыла.

Альбо ў чароўным вершы пра тое, як «пад вербамі ў нагрэтым чоўне дзяўчына мыла валасы» і «яшчэ худзенькімі рукамі вязала мокрыя вузлом». Ці пра Паўлюка Труса, пра тое, як чарнабрыўка вышывала яму кашулю, — «і, як сонца, ёй заходзіла на рукі галава паэта кучаравая...»

Адна з паэм Барадуліна называецца «Вяртанне ў першы снег». Барадуліну ўласціва гэта ясенінскае імкненне да першых, да раніх жыццёвых уражанняў, гэты смутак па незваротным і дарагім, гэта зразумелае ўсім нежаданне «адпусціць» маладосць: «Нават хочацца прызнацца пашпарту назло — мне таксама васемнаццаць!.. Некалі было».

І той жа Барадулін умее быць і лёгкадумна-гарэзным: «Гайдалася-гайдалася вядро — і ў студню села. Чаму ж не здагадалася паслаць і мне на сене?»; і высока-ўсхваляваным, асабліва там, дзе роднае слова, родны край: «А пашчасціць — натрапіцца неруш, — завіняць недзе промні наўзбоч. Неруш свой панясу я аберуч, як слязіну, з матуліных воч»; і трагічна-ўзрушаным, як у радках аб смерці блізкага чалавека: «Зіму за горад вывозяць спешна грузавікі. А хто маю зіму вывезе?»; і нестрымана вясёлым і бесклапотным, як у паэме «Неба тваіх вачэй», пра застолле ў латышскіх сяброў:

Як Юпітэр, плыву
У вянку дубовым.
Песні кружаць галаву,
Стогнуць бочкі-бомы...
Расце з караня
Юны дубочак.
Далёка да дня.
Блізка да бочак!

Перад намі жывы чалавек, пра характар якога, пра чые душэўныя якасці гавораць не дэкларацыі (глядзіце, які я харошы і розны!), а перажыванні, учынкі, думкі, карацей, рэальныя ўзаемаадносіны са светам, з людзьмі.

У самай аснове таго чалавечага вобраза, што раскрывае нам Рыгор Барадулін, ёсць і дагэтуль балючы і дагэтуль радасны ўспамін аб узятым пароўну на ўсіх, на кожнага агульным цяжары першых турбот адразу пасля вызвалення родных мясцін.

Ён увесь адтуль — з апошніх блакад, з палаты «мінёраў», з пажарышча, на якім будавалася новая хата. Нават сама інтэнсіўнасць і прагнасць, з якой Барадулін успрымае сёння жыццё, у пэўнай меры **адтуль**. Ад жадання наглядзецца, наглытацца і за таго сувязнога, што піў нагбом з вядра, дзе «Ільдзінкі і сонца», і не дапіў, скошаны варожай куляй.

Ва ўсім, што Барадулін піша пра тыя часы, — сур'ёзнасць, вынашанасць і праўда. Гэта ўжо паэт амаль эпічны, цалкам павернуты да таго, што складала найпільнейшае і найрэальнейшае ў народным жыцці.

Вялікі ахвотнік пайграцца са словам (дзе-нідзе і няўдала, без меры, а часцей цікава, ад перапоўненага весялосцю сэрца), Барадулін нечакана пераходзіць на стрыманы і скупы расказ, на рэчытатыў, ледзь не на прозу, прыпамінаючы, як маці будавала хату:

...Сталярыла і цяслярыла
без гэбля, без ватэрпаса.
Сякера была адна,
як доля ўдавіная, чэзлая.
З'усяго, што можна было
прыбіць
цвікамі іржавымі,
маці падлогу масціла...

Гэта з паэмы, што так і завецца — «Матчына хата»... Існуе вядомы фразеалагізм «бацькоўская хата». Сімвал, абагульненне. «Удавіная доля» пераасэнсавала яго, зняўшы ўсякую пераноснасць значэнняў, сімвал пераўтварыўшы ў факт: хата, якую будавала маці. Наогул, пра маці, пра Куліну Андрэеўну, Барадулін піша так многа, так добра, з такой замілаванасцю і любоўю, што часам мы можам гаварыць не пра адзін — пра два цэнтральныя вобразы яго паэзіі, і гэта зусім натуральна для паэта, цесна і арганічна звязанага з усім, што было яго вытокам: з матчынай хатай, з Ушаччу... Вернемся, аднак, да паэмы.

Яна — пра народныя мужнасць, пакуты, боль. І адначасова пра велікадушнасць народа:

З усімі шчырэў і палонны
немец.
Густа мох накладаў
І часта ханаў.
Яму гаварылі:
— Старайся зараз, хай цябе
немач.
Навошта паліў хату?
Немец бянтэжыўся і пярачыў.
Паказваў рукамі, што ён тут
нявінен.
Уся талака невялікая
Гарачую бульбу ела вечарам...

«Падпальшчык» (наўрад ці іменна **гэты** немец паліў хату), што разам шчыруе, а потым разам вячэрае з пагарэльцамі, — гэта, па-мойму, адкрыццё, якіх нямнога ў нашай паэзіі апошніх гадоў: яно шмат нам гаворыць пра характар народа, пра яго дабрату і, паўтараю, велікадушнасць...

У адным месцы Барадулін гаворыць пра рыфму: «Якая радасць, калі плаўнікамі тугімі раптам залапоча... на беразе белай паперы»... «Тугое», матэрыяльнае, жывое ўвогуле слова ў Барадуліна, які ўмее мысліць не ўмоўнымі знакамі, не паняццямі, а ўсёй паўнатой закладзенага ў слове зместу, усімі адценнямі яго «ўнутранай» і «знешняй» формы.

Слова і верш Барадуліна — жывыя істоты, і ў іх ёсць той элемент «самацэннасці», які, бясспрэчна, ідзе ад здатнасці аўтара бачыць і паэтызаваць самацэннасць усяго жывога ў людзях, у прыродзе.

За нямногімі выключэннямі, слова Барадуліна, яго асацыятыўныя пераклічкі, сама ўважлівасць паэта да гукавой фактуры радка маюць за сабой не «галаўны», не рацыяналістычны, а вельмі сардэчны, «золатам» пачуцця «забяспечаны» імпульс.

Вось адзін толькі прыклад—верш, прысвечаны Ядвізе і Янку Раманоўскім:

Бацькоўскае зямлі
скупыя лады,
Вясновы парастак
для вас—найлішні.
Тапалянятамі
купаланяты
Каля таполі гордай узняліся.

Тапаляняты-купаланяты... Тут ёсць, вядома, і ўсвядомленая паэтам улада над словам, зусім «нармальнае» жаданне падкрэсліць яго гукавую выразнасць, але ёсць тут і безумоўная праўда **сэнсу**: пяшчота, любоў, выказаныя самой «граматыкай», напамін аб славутай таполі каля дома Купалы і нават не вымаўленая ўголас спасылка на арлянятаў.

Бывае, што гукапіс Барадуліна, яго гульня са словам робяцца элементарна-назойлівымі, і тады ён піша суцэльнымі «бальмантавізмамі» накшталт: «Плывуць плыты па плыні плыткай» ці «лілею млявы плёс люляе».

Бывае, паэт траціць належны маральны кантроль над сабой, і тады яго заносіць убок выпадковая асацыяцыя, вобразны «ход»... Ніяк не магу, напрыклад, прыняць такога верша, як «Карэянка» (з далёкаўсходняга цыклу): «Запаленай цыгаркай свеціцца карэянка», а праз колькі радкоў: «Гэткаю б зацягнуцца — каб аж з вачэй сузор'і!»

Рыгор Барадулін піша «густа», пластычна, не шукаючы лёгкіх і пратаптаных дарог. Але ёсць у яго і залішняя перагушчанасць, празмернае захапленне дэталлю на шкоду агульнаму, сінтэтычнаму.

Хацелася б, каб упартая хада паэта ў многіх выпадках пакідала пасля сябе прасекі прасторнейшыя і святлейшыя!

«Адам і Ева» — твор арганічнай паэзіі, якая многае скажа ўсякаму, хто бачыць у **жывым жыцці** пачатак і канец усіх чалавечых пошукаў, намаганняў, надзей, увесь сэнс таго, што мы робім, пра што марым і думаем.

Р. БЯРОЗКІН.

Рыгор Барадулін. «Адам і Ева». Лірыка. Выдавецтва «Беларусь», 1968.

ДУШЭЎНАЯ ПРАПІСКА І ПАЭТЫЧНЫ ТРАНЗІТ

Уладзімір Варно — паэт нялёгкага лёсу. Але, як гаворыцца, няма ліха без дабра, і чым складанейшы лёс паэта, тым больш радасная ўзнагарода. Жыццё, урэшце, расплачваецца з намі тымі радасцямі, якіх мы варты.

Разгортваю кнігу:

Я с поезда спрыгну,
Я крикну:—Здорово, леса!
Леса отзовутся: — Здорово,
земляк!
«Мы — лясы!»
Деревни зааякают,
Их голоса — как роса:
«Мы — вёски!
Зовут нас: Бярозы, Пяски,
Паясы!»

Гэта першая, шматабяцаючая старонка. Але, калі я прачытаў усю кнігу, з'явілася двайкае пачуццё: павага да паэта і незадаволенасць прачытаным. І міжволі прыгадаўся мне адзін недалёкі чэрвеньскі дзень, калі з раніцы прыпарвала, грымела, хмары наплывалі і сплывалі, а дождж пакапаў-пакапаў і аціх...

Аб чым гэта кніга?

У ёй і ўспаміны аб Сярэдняй Азіі, якую добра ведае Уладзімір Варно, і рамантыка піянерыі трыццатых гадоў, і будні лесапільнага завода, і цаліныя ўражанні, і вершы аб паэтах (Каменскі, Лугаўской), і паэма пра палескага рабінзона... Розныя часы, розныя куткі зямлі. Паэт, вядома, можа пісаць пра ўсё. «Я в долгу перед вишнями Японии», — гаварыў Маякоўскі. Але чытач павінен адчуваць усю важнасць і неабходнасць імпульса, які прымушае паэта ўзяцца за пяро.

У. Варно хоча даказаць, што да ўсяго, пра што б ён ні пісаў, ён не абыякавы. Вось ён спрабуе завесці гаворку з возерам Нарач. Прадмет адлюстравання — тут чыста ўмоўны, маецца на ўвазе нешта большае, што няясна трывожыць наш розум сваёй неабдымнасцю і непрыступнасцю. Варно, на жаль, абмяжоўваецца ў сваёй гаворцы тым, што прынёс возеру прывітанні ад Дона, Ангары і г. д.

У другім вершы — «Спадчына» — паэт расказвае пра свайго бацьку, павятовага лекара, чалавека сціплага і гатовага ў любое надвор'е ісці нямаведама куды, абы толькі памагчы хвораму. Розныя думкі могуць узнікнуць у чытача, але Варно спяшаецца прасталінейна вырашыць і гэтую тэму: вось, маўляў, і я гэтакі ж неспакойны, як бацька, і «оттого и я не сплю ночами, до утра кусая карандаш...»

І ў першым і ў другім вершы размовы не адбылося.

Гэта самае можна сказаць пра вершы «У кнігарні», «Слова аб славе», «Запеўка», «Гарады размаўляюць», «Біруці», «Джэтыгара», «Мая кар'ера». У іх няма так званага другога плана, адносіны да падзеі альбо чалавека сфармуляваны катэгарычна, кропкі пастаўлены, роздуму няма. Кожны з такіх вершаў — як сцяна: падышоў, упёрся — далей ходу няма!

«Как делать карьеру?»—пытае паэт. Папрацуйце ў кар'еры, пакапайце гліну, пацягайце мяшкі — вось і кар'ера працоўнага чалавека. Але гэта ўжо было ў Еўтушэнкі і Барадуліна, і абодва яны напісалі гэтыя вершы ў тыя гады, калі выдаваліся іх першыя кнігі. У той час гульня са словам была для іх арганічна неабходным этапам. Варно ж у сталым узросце паўтарыў тое, што нават у тых паэтаў было не больш чым літаратурнай забаўкай. Але я ўсё ж працытую два апошнія радкі з «Маёй кар'еры»:

Во имя карьеры стихи о
карьере
сработал и вам, карьеристы,
дарю...

Адразу заўважаем слова «сработал», таму што ў кнізе «Праз хмары» многія вершы менавіта зроблены, «сработаны», у іх—упэўненасць завучаных рухаў.

Амаль увесь цаліны цыкл—рытарычныя дыялогі, у якіх паэт сутыкае ілбамі мінулае і сённяшняе. У сапраўднасці ж узаемаадносіны мінулага і сённяшняга куды больш складаныя.

Не птица жесткого пера
Нахохлилась под громом,
Свою судьбу Джетыгора
Кует из руд угрюмых.

«Под громом — угрюмых»—гэта, вядома, не рыфма. Ні прэфіксальная, ні карэнная, ні асанансавая, ні дысанансавая. Але бяда не ў рыфмах і не ў моўных неахайнасцях — іх у кнізе няшмат. Бяда ў тым, што паэт зноў абмежаваўся паспешлівым пераказам гісторыі гарадка, заклаймiў па ходу апавядання «скупцов и скопцов» і завяршыў верш звычайнай для яго дэкларацыяй:

Уже не скажешь: — Эх, дыра.
А молвишь: — Вот так чудо.
Джетыгора, Джетыгора,
Тебя я не забуду.

Між іншым, калі пісаліся гэтыя вершы (я быў сведкам іх нараджэння), у Джэтыгары амаль не было «многоэтажных домов», апетых Варно. Помню, мы ішлі па вуліцы, і ў цэнтры горада нехта стрэліў з акна па дзікай качцы, якая пералятала цераз раку. Ды і былі мы ў Джэтыгары не болей сутак. Цяпер я кажу пра ўсё гэта як звычайны чытач, які прачытаў гэтыя вершы і не паверыў ім. Як рэцэнзент, магу дадаць, што прычына няўдачы гэтага верша, зноў-такі, у беглым знаёмстве паэта са светам, у дадзеным выпадку з Джэтыгарой.

Чытаю пачатак верша «Дзед»:

В морщинах и шрамах
от горьких побед
на кухне сидит,
пригорюнившись, дед,

Вось і зніклі гучныя выклічнікі, стала ціха, сумна, цёпла.

Уперся локтями
в некрашенный стол,
Ни хлеба, ни каши не просит.
Старуха ему огуречный
рассол
и тертую редьку подносит.

Аднак інерцыя павярхоўнага, «транзітнага» адлюстравання жыцця і тут дала аб сабе знаць, і Варно зноў быў пакараны: верш заканчваецца тым, што дзед, былы гарніст, выходзіць на ганак і трубіць у сваю старую баявую трубу... Смешна і непраўдападобна. Старыя людзі вельмі раўніва аберагаюць сваю годнасць.

А «Васілій Каменскі» — сапраўды выдатны верш, ад пачатку да канца напісаны жыва, з душой, з гарэзлівасцю вясёлага таленту:

Как на весь простор
вселенский
да на камском берегу
крестный наш отец
Каменский:
«Ого-го, — кричал. — Могу!»

Тут перад намі і Каменскі, і сам Варно са сваім «Ого-го, могу». У дадзеным выпадку паэт верны сам сабе і не навязвае жыццю свае найграна-бурныя рытмы. Яны, жыццё і рытм, супалі па натуральных законах прыроды і паэзіі.

Хачу назваць яшчэ некалькі ўдалых вершаў у кнізе Ул. Варно. Гэта «Пеўні», «Развітанне з домам», «Жэнька Камісараў», «Мае браткі», «Роднасць», «Біцюгі». У іх — характар і асоба паэта. Але ў іх — і іншыя людзі, падзеі, жыццё. Як, напрыклад, у вершы «Жэнька Камісараў», які нагадвае навелу пра складаныя ўзаемаадносіны двух людзей. Вельмі выразна раскрыты герой верша, Жэнька, яго маладая захопленасць працай, якую ён робіць: «На верблюжьих тропах без воды — гроб», «из моих колодцев Кызылкумы пьют...»

Новая кніга Уладзіміра Варно магла быць больш жывой і глыбокай: сам паэт, якім я яго ведаю, багацейшы і таленавіцейшы, чым яго кніга.

Часам бывае і такое.

Ігар ШКЛЯРЭЎСКІ.

Уладзімір Варно. «Праз хмары». Вершы. На рускай мове. Выдавецтва «Беларусь». Мінск. 1968.

НА ЛАТЫШСКАЙ МОВЕ

Латвійскае дзяржаўнае выдавецтва выпусціла ў перакладзе на латышскую мову раман Янкі Брыля «Птушкі і гнёзды». Пераклаў кнігу Юлій Ванаг. Вокладка мастака Арвіда Галевіуса.

Гэта не першае знаёмства латышскага чытача з творамі Янкі Брыля. Яшчэ ў 1954 годзе на латышскай мове выйшла кніга «У Забалоцці днее», у якую былі ўключаны вядомая аповесць і чатырнаццаць апавяданняў беларускага пісьменніка.

У ліпеньскім нумары літаратурна-мастацкага часопіса «Карогс» надрукаваны апавяданні Васіля Быкава (пераклады Т. Руліса і У. Берзіня), вершы Пятра Глебкі, Максіма Танка і Антона Бялевіча ў перакладзе Е. Стулпана.

З МАЛАДНЯКОЎСКАГА ПЛЕМЯ

ДА 60-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ЮРКІ ЛЯВОННАГА

Упершыню ён выступіў у друку ў 1924 годзе. Спачатку гэта былі селькораўскія допісы, пасля—замалёўкі і нарысы і, нарэшце, вершы.

Ёсць настроі.
А ў іх—пералівы.
Ёсць часіны —
здаюцца сном.
Толькі той на
свеце шчаслівы,
Хто узімку жыве,
як вясною!

Ён з натхненнем, з маладым запалам спяваў аб цудоўнай красе Беларусі, услаўляў магутны паступ Кастрычніка, людзей, што будавалі новае жыццё.

Працаваў паэт даволі шмат. Дастаткова сказаць, што з 1930 па 1935 год ім было выдадзена сем паэтычных зборнікаў: «Штурм», «Жалезныя віхуры», «Разбег», «Стала і мужна», «Смелым крокам», «Камсамольскія вершы» і інш. У вершах, сабраных у гэтых кніжках, прываблівала, перш за ўсё, маладосць пачуцця, светлая радасць:

Над палоскай вузенькай
гарбатай
Пакаленні гнуліся у крук.
А цяпер
Абноўленыя хаты
Спатыкаюць ясную зару.
Па-іншаму гайдае вецер
нівы
І праменні граюць весялей.
Вырастаюць хваляй
калектывы,
Гоняць рэшткі цемры
На сяле...
(«У дзень калектывізацыі»).

Вядома, радкі, што выходзілі з-пад пяра паэта, не заўсёды былі роўнымі ў мастацкіх адносінах. У творчасці Юркі Лявоннага было шмат наноснага, выпадковага, нявынашанага. Былі ў яго вершы-аднадзёнкі, надараліся перапевы чужых матываў і настрояў, але ён сумленна, у меру сваіх сіл і здольнасцей, церабіў свой шлях у паэзіі, і след яго не загубіўся...

Сёння Юрку Лявоннаму споўнілася б шэсцьдзесят. З гэтай нагоды хацелася сказаць пра яго добрае слова, а заадно нагадаць некалькі сваіх сустрэч з паэтам...

Летам 1931 года мы, студэнты Мінскага Вышэйшага педагагічнага інстытута, жылі ў глухой лясной вёсачцы Незнань Глускага раёна. Прыехалі мы сюды нарыхтоўваць дровы для універсітэцкага гарадка.

Юрку Лявоннаму раней не даводзілася працаваць у лесе, ён хутка стамляўся. Асабліва цяжка было секчы дровы. Тапор часта цаляў не туды, куды трэба. Так нарадзілася сцэнка «Лявон-дрывасек». Гэтую сцэнку часта паказваў паэт Сяргей Мурзо сялянам навакольных вёсак, дзе мы часта наладжвалі літаратурныя вечары і канцэрты. Гледзячы на Сяргея Мурзо-дрывасека, літаратурная моладзь — Юрка Бітус, Галіна Гайлевіч, Язэп Зазека, Валеры Маракоў, Зяма Півавараў, Алена Раманоўская, Захар Бірала—ад душы смяялася, і сам Лявонны таксама шчыра пляскаў свайму сябру.

У лютым і сакавіку 1932 года мы, амаль той жа групай, былі на вытворчай практыцы на запалкавай фабрыцы, цвікавым заводзе і дубільна-экстрактным камбінаце ў Рэчыцы: выцягвалі з ледзяной вады Дняпра асінавыя бярвенні і перакочвалі іх у распарачны цэх, працавалі ў фанерным цэху, за макальнымі і набівачнымі машынамі. А ледзь не кожным вечарам выпускалі насценныя газеты, ладзілі літаратурныя вечары. Падрыхтавалі і выпусцілі дзве літаратурныя старонкі ў мясцовай газеце. Юрка Лявонны быў ва ўсіх гэтых справах самы нястомны і працавіты.

Памятаю вялікі літаратурны вечар у Рэчыцкім гарадскім клубе. Прафесар Піятуховіч прачытаў даклад аб тагачасным стане беларускай літаратуры. Шмат увагі ён аддаў творчасці маладых. І калі мы, маладыя, чыталі свае вершы, прысутныя апладзіравалі асабліва дружна. І зноў-такі на долю Юркі выпалі, бадай, самыя дружныя воплескі...

Помніцца і такое—таксама з 1932 года. Аднойчы на калідоры галоўнага корпуса універсітэта (там размяшчаўся педагагічны інстытут) да нас, групы студэнтаў, падышоў прафесар Пятро Бузук. Звяртаючыся да Юркі Лявоннага, ён сказаў:

— Віншую з творчай актыўнасцю. Летась выдалі два зборнікі і сёлета два.—І раптам пажартаваў:—Яно ўжо здаецца і мнагавата... Памятаеце, у Багдановіча: «Трэба з сталі каваць...»?

Лявонны пачырванеў, а прафесар, усміхнуўшыся, шырокім крокам пайшоў па калідоры...

Апошні раз бачыў я Юрку Лявоннага летам 1936 года ў Полацку. Сядзелі мы ў гасцініцы ў старых абшарпаных крэслах, і Юрка расказваў:

— Ты ведаеш, гэта ж прыехаў я правяраць пісьмо адной тутэйшай работніцы. Быў нядаўна ў аднаго чыноўніка. Гляджу на яго без акуляраў і, разумееш, бачу перад сабой толькі тоўстую самапіску... Урэшце, што мы тут сядзім? Пайшлі на нашу вуліцу, пройдземся да Дзвіны...

Мы выйшлі з гасцініцы і доўга хадзілі «нашай вуліцай» — так Юрка называў вуліцу імя Міхася Чарота, якая была ў той час у Полацку. Хадзілі, гаварылі, успаміналі гады вучобы, літаратурныя спрэчкі, паездкі па заводах і фабрыках рэспублікі.

Пасля выйшлі на высокі бераг Дзвіны. Змяркалася. На небе загараліся першыя зоркі, забялеўся велізарны круг месяца. Было ціха і чамусьці самотна.

Раптам Юрка, які доўга маўчаў, загаварыў:

— Памятаеш прафесара Пятра Бузука? Так, сапраўды, трэба з сталі каваць, гартаваць гібкі верш, абрабіць яго трэба з цярпеннем... Іменна так, браце. Пішу кожны дзень, але паказваць не спяшаюся. Не трэба спяшацца друкавацца... Як добра было б, каб я мог забыцца на свае зборнікі вершаў! Не, не, у іх ёсць шмат дарагога для мяне, але ўсё ж...

Юрка Лявонны набліжаўся да сваёй паэтычнай сталасці, калі кожнае слова, перш чым нарадзіцца на свет, доўга выношваецца ў душы, калі ўзрастае адказнасць перад кожным напісаным радком. У яго было шмат задум. На жаль, ім не было суджана збыцца. Наша полацкая сустрэча была апошняй...

Сёння яму было б шэсцьдзесят. Але я не сумняваюся, што і ў свае шэсцьдзесят ён быў бы маладым — малады душой, малады ў творчасці. Бо, наколькі памятаю, ён заўсёды жыў вясною, жыў з юначым «маладнякоўскім» запалам.

Станіслаў ШУШКЕВІЧ.

БОЛЬ АДНАГОДКАЎ-ЗЕМЛЯКОЎ

Паўлюк Трус...

Згадваеш гэтае імя, і адразу прад табою паўстае маладосць—маладосць краіны, маладосць жыцця, пачуццяў, песень. У вершах паэта, у якіх ён апяваў новае жыццё, прынесенае Вялікім Кастрычнікам, было столькі шчырасці, непасрэднасці, маладога захаплення, столькі светлага і чыстага настрою, што яны не маглі не крануць юныя няўрымслівыя сэрцы.

Усяго пяць гадоў працаваў у літаратуры Паўлюк Трус, але і за гэты час ён паспеў стаць адным з самых папулярных і любімых паэтаў камсамоліі канца 20-х гадоў. Без вершаў Паўлюка Труса не праходзіла ніводная камсамольская сходка, літаратурны вечар альбо дыспут, яны гучалі пад час кожнага выступлення гурткоў мастацкай самадзейнасці. Вершы паэта сапраўды памагалі моладзі жыць, вучыцца, працаваць і змагацца.

Ранняя смерць камсамольскага песняра адгукнулася ў сэрцах тагачасных камсамольцаў вялікім смуткам і болем.

У Дзяржаўным архіве літаратуры і мастацтва БССР захоўваецца пісьмо моладзі вёскі Прысынак Узденскага раёна, напісанае ў сувязі са смерцю Паўлюка Труса.

Вось што пісала моладзь у рэдакцыі газет «Савецкая Беларусь», «Чырвоная змена» і «Беларуская вёска»:

«Моладзь вёскі Прысынак Узденскага раёна, праводзячы свята «МЮДу», з вялікім жалем адзначае адсутнасць у сваіх шэрагах лепшага сына беларускай вёскі і яе песняра Паўлюка Труса, які не раз праводзіў культмасавыя вечары з намі, шле спачуванне яго сям'і і абяцае шчыльней аб'яднацца вакол шэрагаў ЛКСМБ, праводзячы ў жыццё ідэі камунізма, аб якіх з надзвычайным майстэрствам пеў наш дарагі сябра П. Трус.

Ад імя прысынкаўскай моладзі сябра ЛКСМБ Бярвішчанскай ячэйкі Іосіф Кантаровіч. 1 верасня 1929 года».

П. ВАЛКАВЕЦ,
супрацоўнік Дзяржаўнага архіва літаратуры і мастацтва БССР.

у хату школу. Бацька згадзіўся: няхай дзеці вучацца. Гардзялкоўскі зараз жа прывозіць да нас настаўніка, якога звалі Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч. Хлопец быў дужа добры, вучыў нас без ніякіх пакаранняў. Ён вырваў нас з рук папа, мы з палёгкай уздыхнулі. Нам стала лягчэй: не вучылі закону боскаму, не вадзілі спяваць у царкву. Настаўнік прыносіў нам беларускія кнігі і газету «Наша ніва». Мы развучвалі вершы, чыталі па-беларуску. Правучыў ён нас да вялікадня і паехаў, больш не вяртаўся. Потым прыязджаў ураднік і распытваў майго бацьку, які ў яго быў настаўнік. Бацька адказваў: «А я не ведаю: пан прывёз, зіму ён правучыў і паехаў». Пасля вялікадня поп сабраў нас і павёў у мястэчка Абчуга на экзамены. За мостам у Абчузе стаяла вялікая старая школа. Там праводзіліся экзамены, якія мы ўсе здалі і атрымалі пасведчанні за подпісамі многіх папоў. З усіх нас, былых вучняў Канстанціна Міхайлавіча, толькі я адзін застаўся жывы. Мне 70 гадоў».

Гэтае пісьмо ад Фёдара Ларыёнавіча мы атрымалі ў пачатку 1964 года. Увесь гэты час мы не пакідалі пошукаў. Сёе-тое ўдалося высветліць, у прыватнасці, якім чынам Я. Колас трапіў у нашы мясціны, як ён працаваў, якую памяць пакінуў пасля сябе ў тутэйшых сялян.

Як вядома, у 1906 годзе ў вёсцы Мікалаеўшчына адбыўся нелегальны настаўніцкі з'езд, адным з арганізатараў якога быў Канстанцін Міхайлавіч. «З'езд быў накрыты паліцыяй. Удзельнікаў з'езда пазвальнялі з настаўніцкіх пасад і аддалі пад суд,—пісаў паэт у аўтабіяграфіі.—Зіму 1906-1907 гадоў, пакуль цягнулася следства, я жыў у брата ва ўрочышчы Смалярня і вучыў дзяцей прыватным парадкам. У гэты ж час пачаў пісаць кнігу для другога года навучання ў беларускай школе («Другое чытанне для дзяцей-беларусаў»). Вясной 1907 года я паехаў у Вільню на работу ў рэдакцыю газеты «Наша ніва», але працаваў там нядоўга. Паліцыя забараніла жыць у Вільні, і я вымушаны быў выехаць з горада».

Як жа трапіў Якуб Колас у вёску Сані Абчугскай воласці Сенненскага павета Магілёўскай губерні (цяпер Талачынскага раёна Віцебскай вобласці)?

У рэдакцыю «Нашай нівы» прыйшло было пісьмо, у якім аўтар пісаў, што збіраецца адкрыць прыватную беларускую школу для сялянскіх дзяцей, гатоў плаціць настаўніку «разы ў тры больш, чым дае казна», прасіў параіць добрага настаўніка. Пісьмо прыслаў вядомы на Магілёўшчыне памешчык Канстанцін Антонавіч Гардзялкоўскі, маёнткі якога былі раскіданы па ўсім Сенненскім павеце. Мясцовыя жыхары гэты ўчынак пана Гардзялкоўскага тлумачаць тым, што бацька яго ўдзельнічаў у паўстанні 1863 года і быў пазбаўлены царскім урадам грамадзянскіх правоў. Сын лічыўся лібералам. Кажуць, што нярэдка ў яго маёнтку хаваліся палітычныя. Якуб Колас, які тады працаваў у «Нашай ніве» за 5 капеек у дзень і якому паліцыя забараніла жыць у Вільні, прыняў гэтую прапанову Гардзялкоўскага і сабраўся ў дарогу. З Вільні да станцыі Слаўнае ён ехаў цягніком. На станцыі яго сустрэў фурман.

Якуб Колас прапанаваў адкрыць школу ў вёсцы Сані. У новай хаце Ларыёна Жураўлёва, якая стаяла на рагу вуліцы, адну палавіну аддалі пад клас. За памяшканне, школьны інвентар і работу настаўніка плаціў Гардзялкоўскі.

Вестка аб адкрыцці прыватнай беларускай школы ў Санях хутка абляцела ўсю ваколіцу. Жадаючых паступіць у гэтую школу аказалася шмат, але настаўнік набіраў вучняў толькі ў чацвёрты клас. Павел Сцяпанавіч Нарчук, жыхар вёскі Сані, гаворыць, што было набрана каля дваццаці вучняў. Займаліся яны па праграме, складзенай Канстанцінам Міхайлавічам. Закону божага і стараславянскай мовы ў гэтай праграме не было. За гэта мясцовы поп непрыхільна ставіўся і да Гардзялкоўскага і асабліва да маладога настаўніка, які, да таго ж, вёў навучанне на беларускай мове. Непрыхільнасць яшчэ больш узрастала ад таго, што са школы ў вёсцы Плоскае, дзе працаваў святы айцец, вучні сталі пераходзіць у школу Якуба Коласа. Канфлікт вельмі абвастрыўся пасля таго, як Я. Коласу стала вядома, што поп моцна пабіў аднаго вучня. Жыхар вёскі Габрылёва Кукушкін Андрэй Рыгоравіч нават расказвае, што Канстанцін Міхайлавіч быццам бы ўзбудзіў судовую справу супраць папа за пабоі вучня.

Дзеці палюбілі беларускага настаўніка. Ён прыносіў на ўрокі газеты на роднай мове, знаёміў вучняў з падзеямі ў краіне, праводзіў гутаркі па допісах, вершах і апавяданнях, якія друкаваліся ў «Нашай ніве», часта чытаў вучням па памяці творы Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, І. Крылова, А. Пушкіна.

«Усё гэта,—успамінае Фёдар Ларыёнавіч Жураўлёў,—запомнілася на ўсё жыццё. Мы адносіліся да заняткаў з вялікай ахвотай, стараліся вучыцца ў такога добрага настаўніка. Адзін толькі хлапчук у нашай групе слабавата вучыўся, гэта Фелікс Федаравіч. Ой і паваждаўся з ім Канстанцін Міхайлавіч, шмат паваждаўся! І дабіўся свайго: Фелікс стаў добра вучыцца».

Знайшлі мы скупыя звесткі і пра грамадскую дзейнасць Я. Коласа ў Санях і Папоўцы. Як паведамляюць старыжылы, у вольны ад заняткаў час настаўнік шчыра гутарыў з сялянамі, цікавіўся іх жыццём. Зрабіць што-небудзь большае ён не мог. Як толькі настаўнік прыехаў на працу ў Сані, начальнік Магілёўскага жандарскага ўпраўлення ў сакрэтным данясенні ад 27 лютага 1908 года паведамляў начальству: «Прыцягнуты пры Мінскім жандарскім упраўленні да дазнання па абвінавачванні ў злачынстве, прадугледжаным 125 арт. Крымін. Улаж. былы настаўнік народнага вучылішча Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч, аддадзены пад асобы нагляд паліцыі, у палавіне студзеня гэтага года прыбыў у маёнтак Габрылёва Абчугскай воласці Сенненскага павета, дзе за ім устаноўлены названы нагляд».

Якуб Колас працаваў у Санях са студзеня 1908 года па канец красавіка таго ж года. Чым быў выкліканы такі хуткі яго ад'езд, што ён нават не дачакаўся здачы экзаменаў сваімі вучнямі? Гэтае пытанне мы пакуль што дэталёва не высветлілі. Можа, прычынай было ўзбуджэнне зноў судовага следства супраць удзельнікаў настаўніцкага з'езда? Летам 1908 года Канстанцін Міхайлавіч даваў прыватныя ўрокі ў Стоўбцах, а 15 верасня ў Мінску адбыўся суд, дзе паэт быў асуджаны да трох гадоў турэмнага зняволення...

Невялікі час прабыў народны пясняр у нашых мясцінах, але ён пакінуў прыкметны след у душах і сэрцах нашых землякоў, усіх тых, хто ведаў яго, вучыўся ў яго, сустракаў яго ў тыя далёкія ўжо гады.

І. РАБКОЎ,
настаўнік Абчугскай сярэдняй школы Крупскага раёна.

Жнівеньскі экран

«І НІХТО ІНШЫ»

Карціна пастаўлена на кінастудыі «Беларусьфільм» па сцэнарыі Сямёна Нагорнага.

— Мне здаецца,—гаворыць рэжысёр-пастаноўшчык Іосіф Шульман,— што наш час асабліва востра ставіць пытанне аб адказнасці кожнага члена таварыства за тое, што ў ім адбываецца. Добрае і дрэннае ў жыцці ў вялікай ступені пачынаецца ў нас саміх. У гэтым—ідэя фільма «І ніхто іншы».

Ролі выконваюць: Іван Апанасавіч—Яўген Цяцерын, Дар'я Васільеўна—Надзежда Фядосава, Фёдар—Пётр Любешкін, Аня—Марыяна Вярцінская, Юра Казанкоў — Сяргей Гурзо, яго маці—Мая Булгакава, Тося—Людміла Вагнер, адвакат—Іван Шаціла.

«УДАР! ЯШЧЭ УДАР!»

Бытворчасць кінастудыі «Ленфільм». Аўтары сцэнарыя — Леў Касіль, Віктар Садоўскі (пры ўдзеле Уладзіміра Куніна), рэжысёр-пастаноўшчык—Віктар Садоўскі.

Фільм пра футбол. Фільм пра сутыкненне двух светапогляду, двух людзей, двух характараў: савецкага трэнера Таманцава і прадстаўніка зарубежнага спорту Артура Бергера.

Ролю трэнера Таманцава выконвае артыст Маскоўскага Малога тэатра Віктар Крыкуноў.

«ПОШУК»

У 1966 годзе студэнт сцэнарнага факультэта Усесаюзнага дзяржаўнага інстытута кінематаграфіі Яўген Хрынюк здаў Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі свой дыпломны сцэнарый «Пошук». Яму пашанцавала: сцэнарый быў уключаны ў тэматычны план Адэскай кінастудыі. І вось фільм гатовы.

Галоўны герой апавядання — малады архітэктар Севярын Серада. Ён не можа заставацца раўнадушным, калі недзе побач робіцца несправядлівасць.

У ролі Северына здымаўся акцёр Маскоўскага тэатра імя Ленінскага камсамола Уладзімір Кароцкі. Гледачы знаёмыя з ім па фільмах «Наш карэспандэнт» (Валодзя Артабалеўскі), «Аднагодкі» (Глеб), «Дзве нядзелі» (Валодзя), «Алёшкава паляванне» (бацька Алёшы).

«ВЕНСКАЯ ПАШТОВАЯ МАРКА»

Гэта камедыйная кінастужка створана рэжысёрам Вельо Кясперам на кінастудыі «Талінфільм» па аднайменнай п'есе эстонскага драматурга Ардзі Лійвеса. Яе героем з'яўляецца наш сучаснік—сціплы савецкі служачы Марцін Роль, заўзяты філаталіст, збіральнік рэдкіх паштовых знакаў.

Роля Марціна была напісана спецыяльна для таленавітага эстонскага акцёра Юры Ярвета. Творчы дыяпазон акцёра ўмяшчае ў саба ролі ад востра камедыйных да сапраўды трагічных—ад апостала Пятра ў «Новым нячыстым з пекла» да малочніка з Мяэкюла з аднайменнага фільма.

□

У жніўні на экраны рэспублікі выпускаюцца таксама новыя мастацкія кінафільмы «Лета 1943» («Таджыкфільм»), «Дарога ў тысячу вёрст» («Казахфільм»), і «Раніцнія званы» («Грузія-фільм»).

З зарубежных кінастужак гледачы змогуць паглядзець «Поезд асобага прызначэння» (Карэя), «Землякі» (Польшча), «Пад сузор'ем Дзевы» (Румынія), «Чалавек у ценю» (Балгарыя), «Дыверсанты» (Югаславія), «Пустэльнікі Альтоны» (Італія), «Антыгона» (Грэцыя), «Анжаліка і король» (Францыя), «Я была шчаслівая тут» (Англія).

НАРОДНЫЯ БАЛАДЫ ЗАКАРПАЦЦЯ

Карпаты — калыска цудоўных народных легенд, казак, паданняў, якія вось ужо сотні гадоў перадаюцца з вуснаў у вусны. Філолагі Ужгарадскага дзяржаўнага універсітэта, закарпацкія літаратары, этнографы і фальклярысты запісалі ў агульнай складанасці больш за 600 баладных тэкстаў. Сто сорак адзін твор з іх увайшоў у зборнік «Народныя балады Закарпацця», выпушчаны выдавецтвам Львоўскага дзяржаўнага універсітэта імя Івана Франка.

У кнізе тры раздзелы: «Сюжэты старадаўняга паходжання», «Балады і песні аб барацьбе з туркамі» і «Баладныя песні феадальнай эпохі». Некаторыя тэксты да гэтага часу яшчэ не публікаваліся, што робіць зборнік асабліва каштоўным для навукі. Сто сорак балад у кнізе—гэта сто сорак шэдэўраў народнай творчасці, якія раскрываюць духоўную і фізічную прыгажосць простага чалавека, яго вернасць ідэалам дабра і справядлівасці, свабодалюбства, веру ў светлую будучыню. Такія песні пра жанчыну-таполю — увасабленне жыццястойкасці народа; пра легендарную прыгажуню Бандароўну, якая гатова прыняць смерць, але не аддацца ў рукі ненавіснага пана. Такая і балада «Смерць Доўбуша», якая ўслаўляе любімага героя карпацкіх горцаў-гуцулаў Алексу Доўбуша слаўнага «ватажка» адважных «апрышкаў» — народных мсціўцаў.

Зборнік балад Закарпацця цікавы і спецыялістам, і шырокаму колу чытачоў: ён дае магчымасць кожнаму «выпіць вады» з невычэрпнай крыніцы народнай мудрасці.

АДН.

РУСКІЯ КАРУНКІ

Рускія карункі вядомыя ўсяму свету і карыстаюцца любоўю не толькі ў сябе на радзіме. Яшчэ ў мінулым стагоддзі спрытныя прадпрыймальнікі ў Францыі арганізавалі вытворчасць вырабаў пад «рускія карункі», і ў Парыжы іх прадавалі пад назваю—рускія гіпюры. Нават гэтая падробка карысталася попытам, хаця ў той час ужо былі вядомыя і славутыя французскія карункі валансен і шанцілі, шытыя карункі — алансон, найтанчэйшыя шаўковыя блонды, брусельскія шытыя і плеценыя, венецыянскія і іспанскія карункі. У гэтым бліскучым радзе далёка не апошняе месца займалі плеценыя рускія карункі.

Калі і кім заведзена на Русі гэта складанае мастацтва, устанавіць цяпер немагчыма, але вядома, што сярод іншых рукадзелляў (шыцця, вышыўкі, вязання і інш.) карункапляценнем займаюцца на нашай зямлі з незапамятных часоў. Старажытныя гісторыкі-летапісцы пакінулі нямала сведчанняў, якія пацвярджаюць гэта. Магутны і слаўны князь Галіцкі Данііл Раманавіч (XIII стагоддзе), прымаючы замежных паслоў, здзівіў іншаземцаў, як зазначае летапісец, гордасцю асанкі і прыгажосцю адзення. А княжаскі ўбор, аказваецца, быў аздоблены карункамі. Для ўпрыгожання княжаскага адзення карункі выраблялися з найтанчэйшай сярэбранай і залатой ніткі — каніцелі, сплеценай з усялякімі бліскаўкамі, пер'ямі і жэмчугам.

Але слава рускіх карункаў пайшла, вядома, не ад гэтых багатых, дарагіх і рэдкіх вырабаў, даступных толькі выбраным. Папулярнасць заваявалі карункі, плеценыя з ільняной ніткі, і прывабнасць іх цалкам залежала ад густу, фантазіі і майстэрства каруначніц.

Матэрыял заўсёды быў пад рукою — нават у самай беднай гаспадарцы звычайна засявалі дзве-тры палоскі ільну. Астатняе ад натхнення. Прыгажосць рускай прыроды, яе здзіўляючая разнастайнасць, старажытныя паданні і легенды — усё гэта з'яўлялася невычэрпнай крыніцай для каруначніц-мастачак.

Доўгія зімы на поўначы. Нячутна падае снег, заносячы лясы і рэкі, пакрываючы палі. Пад пушыстым покрывам спіць да вясны зямля, і няма лепшага часу для рукадзелля. У такую пару ў прасторнай хаце збіраліся дзяўчаты на пасядзелкі. Пад мерны стук каклюшак, пад гукі нетаропкай песні каруначніцы заседжваліся да глыбокай ночы. І марозны ўзор на шыбе, і галінка, інеем зацярушаная, і ажурная сняжынка, ды дзявочая нявыказаная мара — усё заплятаецца ў мудрагелістыя ўзоры.

Гэтыя цудоўныя ўзоры складаюцца з асобных элементаў. Многія з іх каруначніцы ведаюць напамяць. Калі робіцца перапляценне з неперавітых нітак, накшталт ткання, — гэта «палатнянка». Тая ж палатнянка, якая мае форму хвалі, называецца «вілюшкай». Пляценне з перавітых нітак — «сетка». Шнурочак з чатырох нітак — «плецяшок», а шчыльныя авалы або квадраты—«насноўкі». Фон для розных узораў называецца «рашоткай». Есць і шмат іншых элементаў.

Прыгажосць і арыгінальнасць каруначнага вырабу залежыць ад спалучэння розных элементаў. Найбольш простым з'яўляецца лічбовае пляценне, заснаванае на лічэнні нітак. Самыя прыгожыя і складаныя карункі плятуцца па сколках.

Сколак — малюнак, нанесены на кардон або тоўстую паперу, — кладзецца на валік. Па кропках наколу ўколваюцца шпількі, якія паступова аплятаюцца ніткаю. Нітка навіваецца на каклюшкі — точаныя драўляныя палачкі з патаўшчэннем на адным канцы, шыйкаю пасярэдзіне і гузікам на другім канцы. Перабіраючы каклюшкі, каруначніца аплятае шпількі, перавіваючы ніткі адну за другой. Вясёлы стук каклюшак суправаджае няспынны рух умелых пальцаў.

Калі гавораць «рускія карункі», успамінаюцца старажытныя рускія гарады — Волагда, Ялец, Разань, Вятка. Тут, у гэтых месцах, здаўна займаліся народным промыслам — карункапляценнем, і слава пра залатыя рукі майстрых ішла па ўсёй Русі. Але сярод іх самымі вядомымі былі, бадай, валагодскія каруначніцы.

Тут многія сем'і з пакаленне ў пакаленне перадаюць, нібы па эстафеце, гэта арыгінальнае мастацтва. Да гэтага часу на Валагодчыне добрым словам успамінаюць выдатных мастачак Бранцавых. Іх малюнкі — сакавітыя, выразныя — і па сённяшні дзень служаць своеасаблівым эталонам для валагодскіх карункаў.

Валагодскія карункі больш чым любыя іншыя перадаюць прыгажосць рускай прыроды, асабліва непаўторную прыгажосць паўночнай зімы. Спалучэнне шчыльнага, падкрэслена-рэльефнага і тонкага малюнку, частая змена ўзору, геаметрычная дакладнасць пабудовы і адасобленасць некаторых элементаў — усе гэтыя характэрныя асаблівасці валагодскіх карункаў і вызначаюць іх вечную прывабнасць і прыгажосць.

У наш час у Волагдзе і яе ваколіцах занята пляценнем карунак каля васьмі тысяч майстрых. Усе яны аб'яднаны з 1930 года спецыялізаваным саюзам з паэтычнай назваю «Сняжынка». Вось ужо сорак гадоў, як існуе тут прафтэхшкола, якая рыхтуе выдатных каруначніц — сапраўдных майстроў сваёй справы. Сярод іх—аўтар унікальных круглых абрусаў таленавітая Марыя Груніча; стваральніца вялікага прыгажуна-абруса (тры метры ў дыяметры) вядомая Вікторыя Ельфіна і многія іншыя.

Заслужанай любоўю і павагаю карыстаецца старэйшая выкладчыца прафтэхшколы і выдатная мастачка Капіталіна Ісакава. Яна не толькі выхавала дзесяткі таленавітых каруначніц, прывіла ім любоў да сваёй справы, але і стварыла унікальныя работы, слава аб якіх грыміць і па сёння.

Гэта Ісакавай належыць цудоўнае па задуме і выкананні «Паўночнае ззянне». На паўметровым абрусе майстрыца здолела на дзіва ярка і вобразна перадаць казачную прыгажосць рускай зімы, разліў паўночнага ззяння.

Айчынны і зарубежны друк не раз адзначаў цудоўныя карункі па малюнках Анны Караблёвай. Заслона-пано яе работы на Брусельскай выстаўцы ў 1968 годзе атрымала спецыяльную прэмію. Дарэчы, тады ж валагодскія карункі былі адзначаны высокай узнагародай—залатым медалем.

Есць і іншыя месцы на Русі, дзе здаўна займаюцца пляценнем карункаў. Да іх адносіцца Ялец, што ў Ліпецкай вобласці. Ён раскінуўся на беразе ракі Сасны, сярод заліўных лугоў ды светла-серабрыстых бярозавых гаёў. Своеасаблівая прыгажосць гэтых месц—мяккая, з лірычным настроем—не магла не адбіцца на творчасці выдатных тутэйшых каруначніц. Ялецкія карункі, калі параўноўваць іх, скажам, з валагодскімі, лягчэйшыя і танчэйшыя, узоры ў іх не такія выразныя, а пераходы больш плаўныя. І ў гэтым ёсць свая прыгажосць. Празрыстасць і прыгажосць форм, вялікая разнастайнасць элементаў («грачышак», «грощыкаў») надаюць іх творам асаблівую арыгінальнасць. У Яльцы наогул любяць узоры з вялікімі кветкамі, і асаблівую прыхільнасць майстрыхі маюць да старажытнага ўзору «Славянка». Для гэтага ўзору характэрна мудрагелістасць васьміпялёсткавых кветак у вельмі кантрастным—шчыльным і празрыстым пляценні.

І да «вілюшкі» ў Ялецкіх майстрых сваё стаўленне. Гэты ўзор робяць яны не роўным, як у Волагдзе, а рознай шчыльнасці. Гэтым прыёмам яны дасягаюць здзіўляючага эфекту—вырабы атрымліваюцца лёгкімі, светлымі, вясёлымі і прыгожымі. Сваёй прыгажосцю славяцца Ялецкія каруначныя абрусы, накідкі, сурвэткі, каўнерыкі, манжэты і іншыя вырабы.

Аматарам і знаўцам рускіх карункаў вядомыя таксама і вяцкія (цяпер кіраўскія) вырабы. У мастачак гэтага краю свой почырк, свая манера, свае, толькі ім уласцівыя, прыёмы. Іх карункі вызначаюцца рэзкай кантрастнасцю пераходаў пляцення, узоры ярчэй выражаны. І наогул малюнак карункаў больш энергічны, дадзены нібы ў руху, ствараючы ўражанне пералівістасці і цякучасці. Тут, часцей чым у іншых месцах, прыбягаюць да шчапных карункаў. Асаблівасць гэтага спосабу заключаецца ў тым, што некаторыя дэталі плятуцца каклюшкамі, потым яны злучаюцца вязальным кручком. Такім чынам ствараецца цэласнасць і гарманічнасць твора.

Наш расказ пра рускія карункі быў бы няпоўным, калі б мы абышлі маўчаннем разанскія каляровыя, або, як іх яшчэ называюць, міхайлаўскія карункі.

Майстрыхі гарадка Міхайлава плятуць такія квяцістыя і стракатыя малюнкі, што здалёк іх можна прыняць за вышыўку. Захоўваючы рысы старога сялянскага святочнага адзення, міхайлаўскія карункі надзвычай яркія, жыццярадасныя і вясёлыя. Пераважаюць тут чырвоныя таны. У чырвоны ўзор уплятаюцца жоўтыя і сінія ніткі. У спалучэнні з вышыўкаю карункі ствараюць непаўторнае ўражанне кідкасці і выразнасці.

Міхайлаўскія карункі не ўжываюцца як самастойныя вырабы і ідуць на аздабленне.

У наш час рускія ручныя карункі не страцілі сваёй каштоўнасці і знаходзяць усё большы попыт і прызнанне. Яркая індывідуальнасць, непаўторная своеасаблівасць, мастацкая закончанасць твора—усё гэта надае ручным карункам асаблівую непераўзыходзячую прыгажосць і прывабнасць. Вось чаму рускія карункі заўсёды будуць упрыгожваць наша жыццё, наш быт.

Галіна ОЛЬГІНА,
(АДН).

ВЯСЁЛЫ КАРАЎДАШ

Малюнкі Ю. ГРЫГОР'ЕВА.

МАСТАЦТВА на тым баку

«ДЛЯ МЯНЕ ГАЛОЎНАЕ—ГРОШЫ»

Да яго выхадак прывыклі ўжо. Больш таго, ад яго кожны раз чакаюць нечага незвычайнага. А здзіўляць становіцца ўсё цяжэй і цяжэй. І фантазіі не бясконцая, ды і гады не тыя—у 64 не зробіш таго, што можна было ў 34 або нават у 44. Але трэба. Трэба нешта прыдумляць—інакш імя яго забудуць. Больш за ўсё на свеце ён баіцца, што яго забудуць. Гаворка ідзе пра вядомага іспанскага мастака Сальвадора Далі.

Нядаўна, у час транзітнага прыпынку ў Бруселі, на імправізаванай прэс-канферэнцыі мастак без усялякага вагання прадэманстраваў «новы» спосаб жывапісу. Ён заключаўся ў тым, што наватар-«жывапісец», адышоўшы на некалькі крокаў ад мальберта, кідаў на нацягненае палатно смаўжоў, папярэдне вымазаўшы іх у розныя фарбы.

Мясцовыя журналісты рукамі развялі, збянтэжана апусціўшы вочы, а мэтр ад жывапісу ўпісаў яшчэ адну старонку ў сваю такую багатую біяграфію.

У 1904 годзе ў Каталоніі (Іспанія) ў сям'і шаноўнага буржуа, натарыуса па прафесіі, нарадзіўся звычайны хлопчык. З маленства ён цягнецца да фарбаў і пэндзля. Яго прымаюць у Акадэмію мастацтваў у Мадрыдзе. Юнак гадзінамі можа стаяць перад карцінамі Эль-Грэка ў музеі Таледа.

Працаваць ён мог некалькі сутак запар, зачыніўшыся ў сваім пакоі; накіды і эскізы не толькі закрывалі ўсе сцены, але і ўсціналі падлогу ў некалькі пластоў. Многім падабаліся яго пейзажы, прывезеныя з роднай Каталоніі,—кіпарысы, алівы, блакітнаватыя горы, якія вырысоўваюцца ў сухім, празрыстым паветры. Выдатнымі былі і малюнкі Далі—беглыя, лаканічныя і ўпэўненыя. Гэта быў несумненны талент. У 21 год ён адкрывае ў Валенсіі сваю першую выстаўку.

Але разам з тым ужо тады юнак не падобны быў на сваіх аднагодкаў. Гіганцкае славалюбства і фенаменальная ганарлівасць, паводле яго ўласнага прызнання, былі галоўнай спружынай яго паводзін.

— У тры гады я марыў стаць кухарам,—гаворыць ён без усмешкі,—у пяць—Напалеонам. З таго часу славалюбства маё расце няспынна.

Ён не раз заяўляў, што памятае сябе нават у чэраве маці і калі-небудзь абавязкова напіша «Унутрычэраўныя мемуары». «Мемуары» напісаны не былі, а замест гэтага, занядбаўшы свой талент. Далі заняўся распрацоўкай новага «напрамку» ў жывапісе, назваўшы яго «паранаізмам» (ад слова «параноя»). Але нават не гэта стала сэнсам яго жыцця. Далі хвалявала іншае—рэклама.

У 1934 годзе мастак афармляў у Нью-Йорку на 5-й авеню вітрыну універмага Бонві Тэллера. Калі дырэкцыя адважылася ўнесці невялікія змены, абураны Далі ў лютасці разбіў вітрыну. Мастака арыштавалі. Але адусюль ён атрымліваў віншаванні і запэўненні ў добрых пачуццях. Сальвадор «абараняў» свабоду мастака ад пасягнанняў гандляроў.

У 1936 годзе ў Лондане ён з'яўляецца ў вадалазным касцюме на даклад аб парэнойі. У тым жа годзе, калі ў Іспаніі лілася кроў патрыётаў, калі вырашаўся лёс рэспублікі, усе яго сябры па мастацтве безагаворачна сталі на абарону свабоды і дэмакратыі, жыццём заплацілі за падтрымку рэспубліканцаў. На досвітку 19 жніўня 1936 года фалангісты расстралялі гордасць Іспаніі—Федэрыка Гарсія Лорку. Памірае пад арыштам мудры Мігель дэ Унамуна, кінуўшы ў твар катам словы пагарды. Не захацелі жыць у рэакцыйнай Іспаніі таленавітыя Антоніа Мачада і Рафаэль Альберці. І толькі Далі з гордасцю заяўляе, што ён супраць рэспубліканцаў і падтрымлівае Франка, бо яму з дзяцінства не да спадобы... свабода.

1939 год. Далі зноў у Нью-Йорку. Ён упрыгожвае сусветную выстаўку. 17 жывых русалак у празрыстым адзенні пляскаліся ў вялізным акварыуме, размаўлялі па тэлефоне і друкавалі на машынцы пад вадой. Твор называўся «Мара Далі аб Венеры».

У 1954 годзе ў Рыме ён выбраў сабе для прэс-канферэнцыі іншы «касцюм»—белае яйка ў рост чалавека, якое было пакрыта 918 загадкавымі знакамі.

Цяпер цяжка ўсур'ёз гаварыць аб творчасці Далі. Нельга ж выдаваць плён хваробы ўяўлення, што выліваецца на палатно, за творы мастацтва. Зрэшты, на гэтым жа настойвае і сам Далі. «Для мяне галоўнае,—заявіў ён,—грошы. Дайце мне тры мільёны ў год, і я ніколі не дакранусь да пэндзля. Мае карціны мяне цікавяць пастолькі, наколькі яны робяць грошы».

Праўда, ёсць яшчэ сёе-тое, чаго баіцца Далі. Гэта смерць. Ён яе баіцца панічна. Далі ў што б там ні стала хоча застацца жывым. «Я звязаны з амерыканскімі вучонымі, якія навучацца сама пазней праз 15 гадоў замарожваць чалавечае цела адразу ж пасля смерці. Мяне замарозяць і ў гэтым стане будуць захоўваць так доўга, пакуль аднойчы не стане магчымым разбудзіць мяне і зноў зрабіць неўміручым».

М. АНАТОЛЬЕЎ.

КІНО НА СЛУЖБЕ ПЕНТАГОНА

Па старонках амерыканскіх газет упэўнена крочыць бравы сяржант Чэмп Бентан. Ён—стопрацэнтны амерыканец з серыйна штампуемых апавяданняў у карцінках, прыхільнік «свабоды і дэмакратыі», які бясстрашна распраўляецца з камуністамі ў Паўднёвым В'етнаме.

Подзвігі амерыканскіх хлопцаў услаўляюцца ў песнях, тоненькіх танных коміксах і салідных кнігах. «Героям» В'етнама прысвячаюць перадачы тэлевізійныя кампаніі. Гэта зразумела. Людзі, якія развязалі вайну ва В'етнаме, зацікаўлены ў акалпачванні амерыканцаў патрыятычнымі заклікамі.

Свой уклад у кампанію прамыўкі мазгоў вырашыў унесці і Галівуд. На экранах ЗША выйшаў фільм «Зялёныя берэты», які ўслаўляе бясчынствы амерыканскіх «войск спецыяльнага прызначэння». Фільм абурыў многіх у Амерыцы не толькі смакаваннем забойстваў, мардабою і іншых актаў насілля, але і адкрытай прапагандысцкай накіраванасцю.

З першых кадраў з экрана гучыць «Балада аб зялёных берэтах»:

У іх на грудзях—сярэбраныя крылцы,
Гэта—лепшыя людзі Амерыкі,
Сто чалавек пойдуць сёння на выпрабаванні,
Але толькі трое надзенуць зялёныя берэты...

«Лепшыя людзі Амерыкі»—гэта прафесіянальныя дыверсанты і забойцы, ад якіх, паводле слоў часопіса «Ньюсуік», патрабуецца толькі адно: уменне забіваць голымі рукамі. Больш тысячы такіх галаварэзаў знаходзяцца цяпер у Паўднёвым В'етнаме. Іх рукі абліты крывёю патрыётаў, старых, жанчын, дзяцей.

Зразумела, у фільме яны выглядаюць прыстойнымі хлопцамі, дужымі, смелымі, справядлівымі. Так ім даводзіцца забіваць. Так, яны і сайгонскія марыянеткі катуюць палонных. Але, згодна з фільмам, усё гэта робіцца дзеля ўсё той жа «дэмакратыі і свабоды».

Рыса ў новым фільме праведзена гранічна выразна: «добрыя» амерыканскія хлопцы перамагаюць «дрэнных» в'етнамцаў. Нават жоўтая нью-йоркская газета «Дэйлі ньюс» здзівілася такой бясхітраснасці фільма, назвала яго «занадта аднабаковым» і «банальным».

Фільм аб «Зялёных берэтах» быў задуманы і зроблены па аднайменным нашумелым ў Амерыцы рамане Робіна Мура вядомым амерыканскім кінаакцёрам Джонам Уэйнам. Вядомы ён, зрэшты, не толькі як выканаўца каўбойскіх і ваенных роляў, але і як заўзяты антыкамуніст. У чорныя гады макартызму Уэйн запраўляў у Галівудзе арганізацыяй, якая вышуквала сярод акцёраў «падрыўныя элементы» і «камуністычных канспіратараў». З таго часу яго погляды не змяніліся. «Я б уласнаручна расстраляў антываенных дэманстрантаў»,—адкрыта прызнаўся ён не так даўно ў размове з журналістам.

Але справа, урэшце, не ў поглядах Уэйна. Справа ў тым, што фільм знайшоў дарогу да экранаў краіны дзякуючы падтрымцы Белага дома і Пентагона. Прэзідэнт Джонсан знайшоў ідэю пастаноўкі такой кінакарціны «цікавай». Пентагон прадаставіў для здымкаў тэрыторыю ваеннай базы Форт-Бенінг у штаце Джорджыя, ваенную тэхніку, кансультантаў і салдат для масавых сцэн. Генералы Пентагона,—сказалі ў Форт-Бенінгу карэспандэнту часопіса «Нью-Йорк таймс мэгэзін»,—«лічылі, што такі фільм будзе карысны для ваенных і для краіны».

Паказальная акцэнка, якую далі новаму фільму амерыканскія нацысты. «У «Зялёных берэтах» Джона Уэйна,—піша іх газета «Тандэрболт»,—мы, нарэшце, бачым праўду аб змове камуністаў і яўрэяў з мэтаю захопу свету».

...Увечары 19 чэрвеня адзін з вядучых кінатэатраў Нью-Йорка даваў прэм'еру «Зялёных берэтаў». Зяяла агнямі рэклам плошча «Таймс-сквер». Мігаючыя блікі кляліся на твары людзей, многіх у салдацкай форме, якія маршыравалі за складзенай з паліцэйскіх бар'ераў агароджаю. «Ветэраны вайны і рэзервісты»—а многія з іх на сабе пазналі жахі в'етнамскай вайны—патрабавалі спыніць паказ «фашысцкага фільма, які ўслаўляе злачынствы амерыканскіх эсэсаўцаў і прапагандуе забойствы».

Нью-Йорк

Ю. РАМАНЦОЎ,
(ТАСС).

ТЭЛЕБАЧАННЕ

30 ліпеня

Першая праграма. 17-00—«Навіны». 17-15—праграма перадач. 17-20—для дзяцей. «Гара смяшлівая, справядлівая». В'етнамская казка. 17-40—насустрач 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. «Хорастава—зямля партызанская». Тэленарыс. 18-10—Дні В'етнама ў БССР. «Рэпартаж з Паўночнага В'етнама». Дакументальны фільм. 18-30—«Турнір дапытлівых». 19-00 — А. Арбузаў. «Гады вандраванняў». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. Частка другая. Перадача з Ленінграда. 20-15—музычны антракт (М). 20-30—«Час». Інфармацыйная праграма (М). 21-15—«Рэкорды беларускіх алімпійцаў». Кінанарыс пра спаборніцтвы Мемарыяла братоў Знаменскіх. 21-30—Дні В'етнама ў БССР. «Дружба і салідарнасць». Тэлевізійны фільм. 22-00—на IX Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у Сафіі (М). 23-50—«Толькі факты». Праграма перадач.

Другая праграма. 17-05—тэлевізійныя навіны (М). 17-15—для дзяцей. «Прыгоды Буратціна». Мультыплікацыйны фільм (М). 18-30—«Свет сацыялізма» (М). 19-00—рэклама, аб'явы. 19-15—М. Горкі. «Апошнія». Тэлевізійны спектакль. 21-15—міжнародная сустрэча па валейболу. СССР—Японія. Перадача з Палаца спорту Цэнтральнага стадыёна імя У. І. Леніна (М).

31 ліпеня

Першая праграма. 16-45—«Навіны». 16-55—праграма перадач. 17 00—Дні В'етнама ў БССР. «В'етнам—краіна паўднёвая». Пра ДРВ расказвае доктар геаграфічных навук В. Г. Заўрыеў. 17-30—«Юбілейнаму году—высокі ўраджай». Рэпартаж пра ўборку ўраджаю ў Гомельскай вобласці. 17-50—«Навіны». 18-00—«Народны кантроль». Тэлевізійны часопіс. (Уключэнне Брэста. 18-40—Дні В'етнама ў БССР. «Сяброўству мацнець» Перадача прысвячаецца дружбе з моладдзю ДРВ. 19-15—«Час». Інфармацыйная праграма (М). 20-00—міжнародная сустрэча па валейболу. СССР—Японія. Перадача з Палаца спорту Цэнтральнага стадыёна імя У. І. Леніна (М). 21-40—«Згубілася ўнучка». Лялечны фільм (М). 22-00—на IX Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у Сафіі (М). 23-50—«Толькі факты». Праграма перадач.

Другая праграма. 10-05—тэлевізійныя навіны (М). 10-15—для школьнікаў. Усесаюзны злёт юных геолагаў (М). 10-50—на IX Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у Сафіі (М). 12-20—«Табе, юнацтва!». «Назавіце сваіх герояў». Да 50-годдзя ВЛКСМ. Перадача з Кішынёва. 17-05—тэлевізійныя навіны (М). 17-15—«Працоўнай гвардыі байцы». Перадача з Варонежа. 17-30—на IX Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у Сафіі (М). 18-00—праграма каляровага тэлебачання (М). 19-15—па родной краіне. «Блакітны традейбус». Кінанарыс. 19-35—рэклама, аб'явы. 19-45—«Агрэст». Кароткаметражны фільм па апавяданні А. П. Чэхава

1 жніўня

Першая праграма 10-05 — тэлевізійныя навіны (М). 10-15—для дзяцей. «Калючая кропасць». Прэм'ера тэлевізійнага мастацкага фільма. Другая серыя (М). 10-45—для школьнікаў. «На прыз «Скураны мяч». Перадача з Харкава. 11-15—на IX Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у Сафіі (М). 17-00—«Навіны». 17-10 — праграма перадач. 17-15 — для школьнікаў. «Вецер вандраванняў». Навукова-пазнавальная праграма. «Загадка каменнай пліты». (М) 17-45—«Фізкультура і спорт». Тэлевізійны часопіс. «Курс — Мехіка». Трансляцыя на Маскву. 18-30—«На нулявой адзнацы...» (Пра будаўніцтва перадаючай станцыі новага тэлецэнтра ў Мінску). 19-00—Г. Грын. «Трэці чалавек». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля (М). 20-30—«Час». Інфармацыйная праграма (М). 20-55—міжнародная сустрэча па футболу. СССР—Швецыя. Перадача са Швецыі. У перапынку—«Старонкі музычнага календара» (М). 22-50—на IX Сусветным фестывалі моладзі і студэнтаў у Сафіі (М). 23-50—«Толькі факты». Праграма перадач.

Беларускі рэспубліканскі камітэт прафсаюза работнікаў культуры выказвае глыбокае спачуванне члену камітэта Бялевіч Вікторыі Канстанцінаўне з прычыны напаткаўшага яе гора — смерці мужа.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. П. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

Наш адрас і тэлефоны:
г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры—3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі—3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і бытворчай эстэтыкі—3-24-62, аддзела публіцыстыкі—3-22-04, аддзела культуры—3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі—6-25-87.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда». Індэкс 63856. АТ 01336